Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Натар'яльн прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Незапячатаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок калярагі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок калярагі пасьперад тэксту 1 р. — к.
За радок калярагі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпецыяльн. из 50 проц. дарожей.
Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. надбаўку.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумент	25 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 191 (2379) Аўторак, 21-га жніўня 1928 г.

МАЛАДЫЯ АТРАДЫ КАМУНІЗМУ.

Славутны баявы саратнік Камінтэрну—Камуністычны Інтэрнацыянал Моладзі адчыніў у Маскве пасяджэньні свайго чарговага кангрэсу.

За гэтыя гады, як і ўвесь час свайго існаваньня, КІМ у асобе маладых францускіх, расейскіх, кітайскіх і нямецкіх рабочых в самаахвярнай адважнасьцю, з энэргіяй змагаўся на перадавых пазіцыях пралетарскае рэвалюцыі.

Мы аддаём адпаведнае рэвалюцыйным заслугам пралетарскае моладзі і з шчырым захапленьнем сачым за гэраічнай барацьбой камсамольцаў на фронце рабочае рэвалюцыі. Камунізм надае вялікае значэньне арганізацыі моладзі пад сьцягам рэвалюцыі.

У гэтай справе КІМ сустракае на сваім шляху суровы адпор. Рэвалюцыйным камсамольскім арганізацыям капіталізм процістаўляе папоўскія хрысьціянскія саюзы, сацыялістычныя і фашысцкія саюзы моладзі. Капіталістычныя клясы ўсіх краін дасканала разумеюць значэньне заваёвы моладзі. Розным шляхам капіталізм спрабуе арганізаваць моладзь проці рэвалюцыі. У выбары сродкаў для гэтага няма недахопу: капіталізм і фашызм, рэлігія і сацыял-дэмакратыя аднолькава надыходзяць для гэтых мэтаў і аднолькава выкадыстоўваюцца для таго, каб моладзь заставалася гарматным мясам мілітарызму, наслухмянай зброяй у руках капіталістычнае рэакцыі.

Розныя прынады і хітрыя ўлоўкі рэакцыі дапамагалі таму, што проці рэвалюцыйнага камсамолу былі выстаўлены магутныя і шматлікія рэлігійныя, фашысцкія і сацыялістычныя саюзы моладзі. Але в кожным годам у гэтай сьцяне, утворанай капіталістычнай клясай, камсамол робіць вялікія прабоіны. Толькі за 4 гады колькасьць сацыялістычнага інтэрнацыянала моладзі зьменшылася з 250000 да 125000. Сацыялістычныя саюзы моладзі ў асобных краінах занепадаюць і зьмяншаюцца ў сваім ліку. Распад сацыялістычных арганізацый моладзі, выхад маладых рабочых са ўсіх контр-рэвалюцыйных саюзаў адбываецца пад ўплывам агульнага палявеньня пралетарыяту і ў моц рэвалюцыйнае дзейнасьці КІМ'у.

КІМ распаўсюджвае свой уплыў на ўсё большыя і большыя масы пралетарскай моладзі. У Англіі, пасьля наражэньня сацыялістычнага саюзу моладзі, камсамол атрымаў кіраўніцтва юнацкім спартыўным рухам і заваяваў важныя пазіцыі ў прафсаюзах. У Францыі камсамол меў значны посьпех у парляманцкай выбарчай кампаніі і шырока паставіў працу ў арміі і флёце. У Нямеччыне парляманцкія выбары паказалі павялічэньне ўплыву камсамолу на масы рабочай моладзі. У Кітаі камсамол адраджаецца пасьля цяжкіх паражэньняў і ператварацца ў масавую арганізацыю. У шэрагу краін камсамольцы кіруюць шырокімі арганізацыямі моладзі, як „Юнгштурм" і інш. Масавыя кампаніі паказваюць, што кадры моладзі становяцца пад сьцяг рэвалюцыйнай барацьбы, якая вядзецца камсамолам.

На фронце юнацкага руху неабходна выяўляць вялікую арганізацыйную настойлівасьць. Найманнейшая ўвага ва ўсёй працы павінна быць зьвернута на заваёву масаў моладзі, на разьвіцьцё такіх форм барацьбы, якія спрыяюць аб'яднаньню маладых рабочых у камсамоле.

Неабходна энэргічна ўзяцца за прафсаюзную працу сярод маладых рабочых, якіх капіталісты часта выкарыстоўваюць супроць рабочай клясы. Да гэтага абавязвае таксама скарыстаньне юнацкай працы ў капіталістычнай прамысловасьці.

Абвастраньне нацыянальнай праблемы і рост нацыянальна-вызваленчага руху стварылі базу для камсамольскіх арганізацый там, дзе іх раней ня было. Камсамол грае важную ролю ў кітайскай рэвалюцыі. КІМ павінен пашырыць дзейнасьць камсамольскіх арганізацый у імпэрыялістычных краінах. У аднолькавай меры ў капіталістычных краінах КІМ павінен весьці больш энэргічную працу па заваёве маладых батракоў, сялянскай беднаты і ўзмацніць шэрагі рабочай і сялянскай моладзі супроць буржуазеі і абшарнікаў.

Моладзь арганізоўвае кадры імпэрыялістычных армій. У флёце, сярод батракоў, у арміях, сярод салдат антымілітарысцкая праца камсамолу мае вялізарнае значэньне, асабліва ў сувязі з абвастраньнем капіталістычных супярэчнасьцяй, у сувязі з падрыхтоўкай новай імпэрыялістычнай бойні.

Да рознастайнай дзейнасьці па заваёве пралетарскай моладзі—вось які шлях КІМ'у. Кангрэс КІМ'у в гонарам выканае свае абавязкі перад пралетарскай рэвалюцыяй. Новыя кадры байцоў ужо напагатове.

ХВАЛЯ АНТЫІТАЛЬЯНСКІХ ДЭМАНСТРАЦЫЙ У ДАЛМАЦЫІ.

КІРАВАНЬНЕ РУХАМ ПЕРАЙШЛО ДА РАБОЧЫХ. — ІТАЛЬЯНСКАЯ НОТА ПРАТЭСТУ.

ВЕНА, 18-8. Італьянскі пасланьнік у Белградзе, Гальлі, перадаў ноту пратэсту з прычыны антыітальянскіх дэманстрацый у Сьпліце, зьнявагі італьянскага консула і інш. Нота патрабуе задавальненьня, а таксама пакараньня вінаватых.

Выконваючы абавязкі югаслаўскага міністра замежных спраў, Шулянковіч, абяцаў учыніць расьследаваньне.

Водлуг дадатковых паведамленьняў наконт антыітальянскіх дэманстрацый у Далмацыі, 18 жніўня ў Шыбеніку жандары разагналі рабочую дэманстрацыю. Былі параненыя. У Сьпліце дэманстранты штурмавалі італьянскія крамы і закідалі каменьнямі італьянскі параход, у якім перабіты ілюмінатары.

У пачатку дэманстрацыямі кіравала нацыяналістычная арганізацыя абароны „Орюна". Зараз на чале руху проці нэптунскіх канвэнцый стаяць рабочыя.

Шпіянаж Мусаліні за італьянскімі эмігрантамі.

ПАРЫЖ, 15-8. Паводле вестак «Лігі правоў чалавека», італьянская паліцыя адправіла ў Францыю і Бэльгію, пад выглядам віце-консулаў, спэцыяльных агентаў для кіраўніцтва шпіянажам за антыфашысцкімі італьянскімі эмігрантамі. Гэтымі днямі пасьля дамаганьняў аднаго з гэткіх агентаў бэльгійская паліцыя арыштавала ў Брусэлі італьянскага эмігранта, хоць в пункту гледжаньня бэльгійскага законадаўства ня было ніякіх падстаў, якія-б апраўдвалі гэты арышт.

2-гі Інтэрнацыянал—вораг вызваленьня калёній.

Сэсія Лігі Барацьбы з Імпэрыялізмам.

БЭРЛІН, 19-8. Адчынілася сэсія выкананому Лігі Барацьбы з імпэрыялізмам і прыгнечаньнем калёніяльных народаў. Сэсія адбываецца пад старшынствам лідэра ангельскае незалежнае рабочае партыі Мэкстона.

Сэсія ўхваліла рэзалюцыю, у якой пратэстуе проці пастаноў 2-га Інтэрнацыянала па калёніяльным пытаньні. Рэзалюцыя характарызуе гэтыя пастановы, як месацыялістычныя, бо яны маюць на мэце дапамагчы імпэрыялістычным прыгнятальнікам.

Рэзалюцыя зварочвае ўвагу рабочых мас і, у першую чаргу, рабочых калёніяльных і поўкалёніяльных краёў на розьніцу пазіцый II і III Інтэрнацыяналаў па калёніяльным пытаньні.

Румынія сьпешна ўзбройваецца.

ВЕНА, 18-8. 15-га жніўня ў Канстанцы распачаўся „тыдзень вайсковага флёту Румыніі". На адчыненьні сьвята прысутнічалі прадстаўнікі ўраду і вышэйшага камандаваньня. Была наладжана цэрамонія пасьвячэньня 4-х гідрасамалётаў, атрыманых з Італіі ў лік заказанае там эскадрыльлі.

Рэформы Аманулы-хана.

КАБУЛ, 18-8. У вывязку з джыргаю (канграс, у якім бяруць удзел апрача міністраў і іншых вышэйшых чыноўнікаў і прадстаўнікі асобных сацыяльных груп і племяньняў), скліканаю пасьля сьвят незалежнасьці, намячаецца шэраг рэформ у розных галінах дзяржаўнага будаўніцтва і эканомікі Аўганістану. Між іншым, мяркуецца рэарганізаваць некаторыя міністэрствы, у тым ліку міністэрства замежных спраў.

На VI кангрэсе Камінтэрну.

Тэзісы аб калёніяльным пытаньні.

АБМЕН ДУМКАМІ.

МАСКВА, 18-VIII. На ранішнім пасяджэньні кангрэсу Камінтэрну цягнуліся спрэчкі далей па калёніяльным пытаньні.

АЛІМІ (*Інданэзія*) зазначае на неабходнасьць заснаваць самую шчыльную сувязь між эўрапейскімі рабочымі пралетарыятам калёній.

ЛЁЗЭРЭЙ (*Францыя*) гаворыць, што француская кампартыя дасягла вядомых вынікаў у справе арганізацыі калёніяльнага пралетарыяту. Асноўныя задачы кампартыі ў калёніях—падтрымліваць нацыянальна-рэвалюцыйны рух, захоўваючы нашыя клясавыя пазіцыі.

НАРАЯН (*Індыя*) адзначае, што да вайны ангельскі імпэрыялізм усялякім парадкам імкнуўся прыпыніць разьвіцьцё прамысловасьці Індыі. Цяпер яго палітыка ў адносінах да Індыі і мэтады яе эксплёатацыі зьмяніліся. Асноўная прычына гэтага—немагчымасьць абярнуць Індыю ў ваенную базу ангельскага імпэрыялізму без адпаведных уступак індыйскай буржуазеі.

ГРЫФФІН (*Новая Зеляндыя*) зазначае, што Аўстралія і Новая Зеляндыя вядуць самастойную імпэрыялісцкую палітыку, довадам чаго зьяўляецца экспэдыцыя на выспы Фіджы. У тэзісах трэба падрабязна спыніцца на ходзе імпэрыялістычнае калёніізацыі, каб можна было выразна намеціць лінію партыі ў калёніяльным пытаньні.

ДЖОНС (*Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты*) гаворыць, што амэрыканская кампартыя згодна з лёзунгам самавызначэньня мурынаў з мэтаю заснаваньня мурынскае савецкае рэспублікі ў Злучаных Штатах.

Галоўная задача амэрыканскае кампартыі — узмацніць арганізацыйную працу сярод мурынаў.

КАНТРЭРАС (*Мэксыка*) лічыць прапанаваны т. Эмбэр-Дро лёзунг „лацінa-амэрыканізму" небясьпечным, бо масы могуць яго ня так зразумець. Трэба, наадварот, мацней падкрэсьліць неабходнасьць сувязі пралетарыяту лацінскае Амэрыкі з рабочай клясай Паўночнае Амэрыкі.

Прамоўца лічыць неабходным зьвярнуць больш увагі пытаньню аб індзейцах, абараняць іх правы і прыцягнуць іх да адзінага рэвалюцыйнага фронту проці імпэрыялізму.

ПЭППЕР (*Амэрыка*) знаходзіць асноўную лінію тэзісаў па калёніяльным пытаньні правільнаю. Высунутая тав. Лёмінадзэ тэорыя парляманцкае рэвалюцыі ў Кітаі перасквавала праз этапы буржуазна-дэмакратычнае рэвалюцыі і таму носіць трацкісцкі характар. Дадзенае Сталіным вызначэньне буржуазна-дэмакратычнае рэвалюцыі ў калёніях, як аб'яднаньня барацьбы проці імпэрыялізму з барацьбою проці перажыткаў фэадалізму зьяўляецца клясычным і распаўсюджваецца на Індыю, Кітай і ўсе калёніі і паўкалёніі. Асноўная задача—весьці барацьбу проці імпэрыялізму і ваеннае небясьпекі.

РЭММЭЛЕ (*Нямеччына*) гаворыць: «Калі некаторыя таварышы гавораць аб „імпэрыялістычнай індустрыялізацыі" калёній, як аб рэвалюцыянізуючым і прагрэсыўным фактары, дык ствараецца ўражаньне, што яны ня крытычна паўтараюць тэорыі ідэалёгаў Лігі Нацый і 2-га Інтэрнацыяналу. Пункт гледжаньня гэтых таварышоў уяўляе сабою рэвізію ленінізму, в якою трэба змагацца самым рашучым чынам. Імпэрыялізм зусім ня фактар прагрэсу ў калёніях, наадварот, ён фактар затрымкі і нават эруйнаваньня эканамічнага разьвіцьця калёній. У Індыі па машынабудаўнічай прамысловасьці панаваньне імпэрыялізму прывяло да спыненьня экспарту тэкстыльных тавараў з Індыі. Галіны прамысловасьці, якія разьвіваліся ў Індыі ад часу абвяшчэньня сусьветнае вайны, служаць ваенным мэтам і цалком падначалены ангельскаму вайсковаму міністэрству.

Папраўкі т. Лазоўскага.

Вячэрняе пасяджэньне кангрэсу Камінтэрну 18 жніўня адбываецца пад старшынствам т. Шульлера. На парадку дню—працяг спрэчак наконт калёніяльнага пытаньня.

Прамова т. Лазоўскага. Новае, што здарылася з часу другога ўсясьветнага кангрэсу Камінтэрну, калі была ўхвалена прапанаваная Леніным рэзалюцыя па калёніяльным пытаньні, у тым, што шмат у якіх калёніяльных і поўкалёніяльных краёх пралетарыят пачаў выступаць, як самастойная рэвалюцыйная сіла. Гэтае зьявішча зьвязана з поўным разьвіцьцём калёніяльных краёў.

Зразумела, няправільна будаваць на падставе гэтых фактаў тэорыю „раскалёнізаваньня", якую тэзісы правільна характарызуюць, як некамуністычную. Аднак, няправільна таксама казаць, што калёніі ўяўляюць сабою сельска-гаспадарны «тыл» капіталізму. Такая характарыстыка супярэчыць лёзунгу дыктатуры пралетарыяту і сялянства, бо ажыцьцяўленьне гэтага лёзунгу мяркуе, што калёнія дасягнула пэўнае ступені прамысловага разьвіцьця.

Некаторыя таварышы, асабліва з Лацінскае Амэрыкі, беспадстаўна баяцца, што лёзунг буржуазна-дэмакратычнае рэвалюцыі зьмяншае значэньне ролі пралетарыяту і кампартыі. Гэта непаразуменьне. Ленінізм патрабуе, каб у буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі кіруючую ролю адыгрываў іменна пралетарыят. Гэта належыць падкрэсьліць у тэзісах і больш дакладна вызначыць бальшавіцкі лёзунг дыктатуры пралетарыяту і сялянства.

Тэарэтычна, зразумела, правільна, што пралетарыят можа час-ад-часу ня толькі падтрымліваць калёніяльную буржуазею, але і ўваходзіць в ёю ў згоду. Аднак, аўтары тэзісаў робяць палітычную памылку, калі кажуць, што задачаю індыйскага пралетарыяту зьяўляецца падтрыманьне сваяраджыстаў (індыйскія нацыяналісты). Гэта зусім не зьяўляецца галоўнаю задачаю індыйскага пралетарыяту. Галоўная задача яго—стварыць самастойны рэвалюцыйны рабочы рух і вывяліць арганізацыі рабочых і сялян ад сваяраджыстаў.

У тэзісах амаль нічога не гаворыцца аб рэфармізьме сярод пралетарыяту калёніяльных і поўкалёніяльных краёў. У гэтай частцы тэзісы трэба пашырыць.

Прамова тав. Арно.

(Англія).

Ад імя ангельскае делегацыі я падаю папраўку да тэзісаў. У спрэчках выявілася непаразуменьне ў зьвязку з пазіцыяй ангельскае делегацыі ў пытаньні наконт індустрыялізацыі і «раскалёнізаваньне» Індыі. Ангельская делегацыя ніколі не абараняла тэорыі «раскалёнізаваньня». Аднак ангельская делегацыя зазначае на памылковую фармулёўку тэзісаў у пытаньні аб індустрыялізацыі. Пад індустрыялізацыяй Індыі мы разумеем не пераважаючае становішча прамысловасьці, а яе рост. Тэарэтычная памылка тэзісаў у тым, што яны спрабуюць растлумачыць сучасную палітыку манапалісцкага капіталізму ў Індыі, грунтуючыся на дачыненьнях перыяду прамысловага капіталізму. Гэта дае памылковыя практычныя вывады. Тэзісы павінны выразна намаляваць агульны закон капіталістычнага разьвіцьця, згодна якога экспарт капіталу выклікае тэндэнцыю да паскораньня разьвіцьця прамысловасьці ў калёніяльных краёх.

Імпэрыялізм таксама не зважаючы на шматлікія супярэчнасьці, паказвае тэндэнцыю спрыяць росту прамысловасьці. Бясспрэчна, што ў перыяд фінансавага капіталу палітыка ангельскага імпэрыялізму ў Індыі зьмянілася. Уклад капіталу ў дзяржаўныя павыкі зьяўляецца звычайнаю формаю экспарту капіталу і спрыяе разьвіцьцю прамысловасьці.

Статыстычныя даныя сьведчаць пра рост прамысловасьці ў Індыі і асабліва пра рост вырабу сталі.

* * *

Чарговае пленарнае пасяджэньне ў панядзелак 20-8 зранку.

Адчыніўся V усясьветны кангрэс КІМ'у.

Кангрэс працягнецца 2 тыдні.

МАСКВА, 20-га жніўня. Адбылося ўрачыстае адчыненьне V усясьветнага Кангрэсу Камуністычнага Інтэрнацыяналу Моладзі.

На кангрэс прыехалі дэлегаты з усіх частак сьвету. Сярод іх—делегаты камуністычнае моладзі самых далёкіх краёў.

Дзелавая праца кангрэсу распачнецца зараз-жа пасьля сканчэньня працы 6-га кангрэсу Камінтэрну,—прыблізна праз тыдзень. Кангрэс працягнецца 2 тыдні. На адчыненьні кангрэсу в прывітальнымі выступаць т. т. Бухарын, Тэльман, прадстаўнікі маскоўскае рабочае моладзі, падшэфнае КІМ'у дывізіі і г. д.

Дэлегацыя на кангрэсе ад УсеЛКСМ складаецца з 35-ці асоб з правам рашаючага голасу і некалькіх таварышоў з правам дарадчага голасу.

Келёг выехаў у Парыж.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ПРОЦІ ПАКТУ КЕЛЁГА Ў НЬЮ-ЁРКУ.

НЬЮ-ЁРК, 18-VIII. Келёг і канадакі прэм'ер Макензі-Кінг выехалі ў Парыж.

Больш 100 сяброў усеамэрыканскае антыімпэрыялісцкае лігі наладзілі сёньня дэманстрацыю са сьцягамі, на якіх былі напісаны лёзунгі:

«Рукі прэч ад Кітаю», «прэч амэрыканскі імпэрыялізм,» «прэч абдурваючы мірны ўгавор Келёга» і інш. Паліцыя разагнала дэманстрантаў.

ДОШКА Ў ПАМЯЦЬ ЛЕНІНА Ў ЦУРЫХУ.

БЭРЛІН, 16-8. Паводле вестак з Цурыху, уласьнік будынку, у якім жыў Ленін у часе эміграцыі ў Цурыху, падаў у судовым парадку скаргу на пастанову Цурыхскага муніцыпалітэту прыбіць на гэтым будынку памятную дошку.

„Пакрыўджаны" паказвае, што муніцыпалітэт не атрымаў згоднае згоды, і прыбітая памятная дошка «непрыяцела ўлады» на ход згодна ў „ростарану", які знаходзіцца ў гэтым доме.

Яшчэ да таго, як уласьнік дому падаў скаргу, цурыхскі буржуазны друк распачаў лютую кампанію супроць таго, каб прыбіваць у Цурыху дошку ў памяць Леніна.

ФРАНЦУСКУЮ КАМПАРТЫЮ ЧАКАЮЦЬ НОВЫЯ РЭПРЭСІІ.

ПАРЫЖ, 17-8. Правы францускі друк на чале з «Тан» выказвае непакой наконт прапаганды камуністаў сярод прызыўнікоў, якая нарыдычна выклікае шматлікія антымілітарысцкія дэманстрацыі; друк дамагаецца ўжыць рашучыя заходы проці кампартыі, і, між іншым, проці «Юманіта».

Рэвалюцыйны наступ шанхайскіх рабочых.

ШАНХАЙ, 18-VIII. Паліцыя шанхайскага францускага кварталу арыштавала некалькі бастуючых рабочых і служачых розьнічных крам за расклейку плякатаў в заклікам, каб шанхайскія рабочыя далучыліся да забастоўкі.

Паліцыя выкрыла на шмат якіх памяшканьнях такія кітайскія надпісы: «Прэч Гаміндан», «Усе на падтрыманьне газэты».

СТАЧКІ Ў ШАНХАІ ЗАБАРОНЕНЫ.

ШАНХАЙ. Мясцовая цывільная і вайсковая ўлада агаласіла загад аб забароне забастовак і заснаваньня новых прафсаюзных арганізацый без дазволу органаў ураду ці Гаміндану.

РАЗГОН ПРАФСАЮЗАЎ І ВОБЫСКІ Ў ПЕКІНЕ.

ПЕКІН, 17-VIII. На нарадзе вайсковае і цывільнае улады паведамлялася, што гэтымі днямі ў горадзе зьявіліся камуністычныя агітатары, якія падбухторваюць рабочых да забастоўкі. Нарада ўхваліла правесьці вобыскі ў рэстаранах.

Учора пэкінская паліцыя апячатала памяшканьні прафсаюзаў, якія далучаюцца да пекінскае фэдэрацыі працы.

ХІСТАНЬНІ СЯРОД ЯПОНСКІХ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ У «КІТАЙСКІМ ПЫТАНЬНІ».

ТОКІЁ, 18-8. «Токіё Асакі» паведамляе, што на пасяджэньні габінэту ўхвалена заняць у адносінах да Нанкіну і Мукдэну пазіцыю «пільнага чаканьня».

Водлуг вестак «Хоці», Японія ўсё-ж такі паспрабуе вырашыць некаторыя важныя пытаньні ў сьпешным парадку, каб выкарыстаць сучаснае ахалоджаньне між Мукдэнам і Нанкінам.

Прэм'ер Танака гутарыў з віконтам Гато, Кіёра і Канэко наконт кітайскага пытаньня. Водлуг вестак «Токіё Асакі», гутарыўшыя з прэм'ерам раілі яму трымацца ў Кітаі ранейшага курсу, але ў поўнай згодзе са Злучанымі Штатамі і Англіяй. Як думае «Токіё Асакі», гэтая нарада разам з апошнімі ваеннымі ўраду ў кітайскім пытаньні, даводзіць, што Танака ня мае новага напрамку паводзін.

Прычэпка для рэпрэсій проці індускіх рэвалюцыянэраў.

ЛЁНДАН, 18-8. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Делі (сталіца Індыі): «Індыйскі ўрад агаласіў тэкст вялікага ліста індыйскага камуністычнага лідэра Роя да ЦК кампартыі Індыі і індыйскае рабоча-сялянскае партыі. Ліст датавины 30 сьнежня леташняга году.

Ліст дае дырэктывы для разгортваньня актыўнае камуністычнае кампаніі ў Індыі. У ім падкрэсьлівацца, што кампартыя павінна знаходзіцца ў нелегальным становішчы і дзейнічаць вельмі таемна. Адкрытая прапаганда камуністаў павінна праводзіцца рабоча-сялянскай партыяй. Галоўнаю мэтаю гэтае прапаганды зьяўляецца, па-першае, скасаваць імпэрыялістычнае панаваньне, падругое, заснаваць дэмакратычную дзяржаву, даўшы поўныя палітычныя правы рабочым і сялянам, патрэцяе, нацыяналізаваць зямлю і, пачацьвертае—зьнішчыць буйнае земляўласьніцтва.

Ліст раіць таксама высоўваць розныя патрабаваньні аб палепшаньні матар'яльнага становішча сялян.

Меншавіцкі ЦК заадно з Мюльлерам і Гільфэрдынгам.

ЯК КІРАЎНІЦТВА САЦ.-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ПАРТЫІ „ПАКАРАЛА" СВАІХ МІНІСТРАЎ-ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ.

БЭРЛІН, 18-8. Агенцтва Вольфа паведамляе: «Адбылося супольнае пасяджэньне ЦК сацыял-дэмакратычнае партыі і сацыял-дэмакратычнае фракцыі рэйхстагу в мэтаю заняць пэўную пазіцыю па пытаньні наконт пастановы габінэту распачаць пабудову панцырнага крэйсэра. Большасьцю чатырох пятых галасоў ухвалена пастанова, у якой ЦК і парляманцкая фракцыя с.-д. партыі выказваюць жаль, што с.-д. міністры згадзіліся в пастановаю габінэту, не параіўшыся наконт гэтага з ЦК. Аднак, удзел сацыял-дэмакратаў на ўрадзе зьяўляецца, водлуг слоў резалюцыі, нагэтулькі важным для інтарэсаў рабочае клясы, што, не зважаючы на рознасьць думак на пытаньні аб панцырным крэйсэры, няма патрэбы дамагацца ад сацыял-дэмакратычных міністраў выхаду з габінэту».

МАРСКОЕ ВЕДАМСТВА НЯ ХОЧА ЗАЦЯГВАЦЬ СПРАВУ.

БЭРЛІН, 17-8. Начальнік марскога ведамства даў ужо суднабудаўнічым прадпрыёмствам заказ на пабудову панцырнага крэйсэра «А».

КАМПАРТЫЯ ДАМАГАЕЦЦА ПЛЕБІСЦЫТУ.

ПРАТЭСТЫ РАБОЧЫХ ПРЫДУШВАЮЦЦА СІЛАЮ ПАЛІЦЫІ.

БЭРЛІН, 18-VIII. Кампартыя ня спыняе кампаніі проці пабудовы панцырнага крэйсэра, дамагаючыся вырашыць гэтае пытаньне праз усенароднае галасаваньне.

У некаторых гарадох адбыліся арганізаваныя кампартыяй сходы пратэсту. У Бэрліне і ў Мангейме здарыліся стычкі з паліцыяй. У Мангейме паліцыя пусьціла ў ход проці ўдзельнікаў сходу гумовыя кіі, учыніла шмат арыштаў і канфіскавала распаўсюджаныя на сходзе лістоўкі.

У Саюзе ССР.

Ніводнага працоўнага без аблігцыі пазыкі

Зварот тав. Калініна да сялянства.

МАСКВА, 19-VIII. У зьвязку з выпускам 2-е пазыкі індустрыялізацыі, старшыня ЦВК СССР Калінін у звароце да сялян зазначае:

Савецкі ўрад вядзе сваю гаспадарку з дапамогаю і пры непасрэдным удзеле шырокіх працоўных рабоча-сялянскіх мас. Толькі дзякуючы таму, што ў нашае будаўніцтва ўцягнуты шматмілённыя масы, нашая гаспадарка год за годам і дзень за днём робіць усё большыя посьпехі.

Але мы ня можам задаволіцца дасягнутым. Толькі ў тым выпадку, калі мы злучым у адно ня толькі нашыя сілы, але і сродкі, мы будзем упэўнена і цьвёрда ісьці наперад.

Працоўныя нашага Саюзу дасканала ўявілі сабе, якое вялізарнае значэньне маюць для нашага гаспадарчага разьвіцьця дзяржаўныя пазыкі. Аб гэтым лепш усяго гаворыць посьпех першае пазыкі індустрыялізацыі ў горадзе і пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі—на вёсцы.

Зараз урад СССР выпусьціў адзіную рабоча-сялянскую пазыку індустрыялізацыі для гораду і вёскі. Умовы пазыкі дазваляюць падпісвацца кожнаму рабочаму і селяніну. Пры гэтым кожны селянін і сялянка павінны ведаць, што падпіска на пазыку будзе праводзіцца выключна дабрахвотна. Ніякага прымусу ня можа быць і ня будзе.

Пасьпешнае разьмяшчэньне другое пазыкі індустрыялізацыі будзе мець вялізнае значэньне ня толькі для агульнага разьвіцьця прамысловасьці і сельскае гаспадаркі, але і для задаволеньня мясцовых патрэб, бо дзесятая частка пазыкі будзе пакінута ў мясцовым бюджэце.

Асноваю моцнасьці Савецкага Саюзу зьяўляецца саюз рабочых і сялян. Пазыка індустрыялізацыі аб'яднае сілы рабоча-сялянскіх мас у справе індустрыялізацыі краю і яшчэ больш умацуе саюз рабочае клясы з сялянствам. *Вось чаму я ўпэўнен, што гэтая пазыка будзе дружна раскуплена.*

Падпіска на гэтую пазыку—абавязак кожнага працоўнага гораду і вёскі.

Пазыка павінна зацікавіць вёску.

Зварот АППО ЦК да усіх партарганізацый.

МАСКВА, 19-8. АППО ЦК УсеКП(б) у звароце да ўсіх партыйных арганізацый зазначае, што новая пазыка зьяўляецца самаю буйнаю крэдытнаю апэрацыяй, якая калі-небудзь праводзілася савецкім урадам.

АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ партыйныя арганізацыі павінны зьвярнуць НА РЭАЛІЗАЦЫЮ НОВАЕ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ. Неабходна адначасна з кампаніяй па пазыцы растлумачыць шырокім масам сялянства, што элементы прымусу, меўшыя месца пры рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі, зьявіліся перагібамі і скажэньнямі палітыкі ўраду ў дзяржаўных пазыках, і што НОВАЯ ПАЗЫКА БУДЗЕ РАЗЬМЯРКОЎВАЦЦА Ў ГОРАДЗЕ І НА ВЁСЦЫ БЯЗ ЎЖЫВАНЬНЯ МЭТАДАЎ АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА ПРЫМУСУ.

У якасьці кампэнсацыі мер АППО ЦК радзіць на месцах вылучыць дакладна праінструктаваны аб значэньні і тэхніцы пазыкі кадр дакладчыкаў-агітатараў, прыцягваючы да працы і беспартыйны сялянскі актыў. Арганізаваць і правесьці дакады аб пазыцы на ўсіх агульных сходах ячэек, агульных і пахавых сходах рабочых і служачых усіх фабрычна-заводзкіх прадпрыёмстваў і ўстаноў, а таксама на сялянскіх сходах на вёсцы. Устанавіць аталую інфармацыю аб пазыцы сялян, якія спыняюцца ў горадзе ў Домах Селяніна і наладжваць рэгулярныя гутаркі з імі аб пазыцы, яе выгодах, значэньні і мэтах. Шырока выкарыстаць на вёсцы хаты-чытальні і клюбы, абарнуўшы іх у рэгулярна працуючыя ячэйкі па папулярызацыі новае пазыкі. Прыцягнуць да антыўнага ўдзелу ў кампаніі па рэалізацыі пазыкі на вёсцы настаўніцкі персанал, агранома, каморнікаў і ўсе іншыя культурныя сілы вёскі. Шырока выкарыстаць для папулярызацыі пазыкі кіно-перасоўкі, радыё, насьценныя газэты і інш. Пастаўіць рэгулярнае асьвятленьне ходу кампаніі па пазыцы і агітацыю за падпіску на старонках газэт і часопісаў. Выкарыстаць зьезды, канферэнцыі, нарады і ўсе культурна-асьветныя арганізацыі для папулярызацыі і агітацыі за пазыку.

Пазыкі пад заклад аблігацый.

МАСКВА, 19-8. 1-га верасьня ва ўсіх крэдытных установах і касах ашчадкасьці СССР распачнецца выдача пазык пад заклад аблігацый пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі ў разьмеры 50 проц. намінулу.

Хлебазагатоўкі.

МАСКВА, 19-VIII. За трэцюю пяцідзённую жніўня ўсімі канторамі Саюзхлеба загатоўлена ў СССР хлебафуражу і масланасеньня 3.739 дэкатон проці 2.578 дэкатон за другую пяцідзённую.

Пэрсанальная пэнсія аўтару „Інтэрнацыяналу".

МАСКВА. Саюзны СНК вызначыў аўтару музыкі „Інтэрнацыяналу" Дэжэйтэру пэрсанальную пэнсію ў разьмеры 100 далараў у месяц.

Сотні чужаземцаў-турыстаў у Маскве.

МАСКВА, 19-8. У Маскву спэцыяльным поездам з Ленінграду прыехала каля 400 турыстаў, сярод якіх гішпанцы, паўднёва-амэрыканцы, вялікая група немцаў, шмат італьянцаў, ангельцаў і французаў. У ліку турыстаў-дыпляматы, фінансісты, фабрыканты, журналісты.

На адказных пасадах у Смаленску—рабочыя-вылучэнцы.

СМАЛЕНСК, 18-VIII. За апошнія дні на адказную працу пасланы 30 рабочых ад варотату. Сьлесар т. Румянцаў і наборшчык т. Марозаў назначаны сябрамі губэрнскага суду. Рабочы дражджавога заводу т. Цурынаў назначан памоцнікам загадчыка губэрнскае зямельнае ўправы, працаўскі рабочы т. Міцаеў—загадчыкам аддзелу працы, памоцнік цыгніковага мастыстага т. Юшкевіч—дырэктарам заводу імя Калініна. Усе 30 вылучэнцаў ужо распачалі працу.

Новы пішучы радыёапарат.

ЛЕНІНГРАД, 19-8. У трэсьце заводаў слабога току змайстраваны новы пішучы прыёмны радыё-апарат, які працуе на кароткіх хвалях. Выпрабаваньне апарату дало здавальняючыя вынікі. Апарат прымае ад 400 да 700 літар у хвіліну. Першыя апараты ўстанаўляюцца ў Петрапаўлаўску на Камчатцы, у Якуцку і некаторых пунктах Сібіру.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

АДКАЗ РАБОЧЫХ ПОЛЬШЧЫ НА ВІЛЕНСКІ ЗЬЕЗД ФАШЫСТАЎ.

ВАРШАВА, 18-8. У шмат якіх гарадох Заходняе Украіны і Дамброўскім райёне, у зьвязку з легіянэрскаю ўрачыстасьцю ў Вільні, на тэлеграфных праводох і на брамах фабрык і заводаў зьявіліся плякаты з надпісамі: «Прэч вайну з СССР», „Фашысцкі ўрад рыхтуецца захапіць Коўню“, «Няхай жыве СССР—цытадэль сусьветнае рэвалюцыі».

Выбух бомбы.

Уночы 13 жніўня г. г. у Радзенкаве, пав. Тараноўскія Горы, невядомыя асобы падкінулі на двор дому № 7 на вул. Сабескага бомбу, якая выбухла і зьнішчыла 40 шыб.

Забарона вывазу аўса.

У сувязі з сярэднім ураджаем аўса ў бягучым годзе будзе забаронена экспартаваць авёс з Польшчы заграніцу, каб умажліваць дастатковае пакрыцьцё запатрабаваньняў унутранага рынку Польшчы.

Будова шашы Вільня-Ліда.

«Слово» паведамляе, што па загаду адведнай улады будова новай масыўнай шашы Вільня-Ліда адбываецца ў прысьпешаным парадку. На работы прыняты апошнімі днямі новых 200 работнікаў.

Напад на асадніка.

Уначы 12 жніўня г. г. у вёсцы Ковенскае Вока, Троцкай вол., тры нейкіх асобы напалі на жыхара асадніцкага фальварку Іваноўскага Ю., якому нанесьлі цяжкія параненьні.

Прадстаўнікі УІ кангрэсу Камінтэрну ў Менску.

ДЭЛЕГАТАМ КАНГРЭСУ КАМІНТЭРНУ ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ АД ПРАЦОЎНАЕ БЕЛАРУСІ.

УРАЧЫСТАЕ СПАТКАНЬНЕ НА ВАКЗАЛЕ МББ ЧЫГУНКІ.

Яшчэ а 5-й гадзіне пачалі зьбірацца працоўныя Менску і чырвонаармейцы да вакзалу МББ. Усе хацелі ўбачыць дэлегатаў кангрэсу, гэтых барацьбітоў за вызваленьне рабочае клясы.

Дэлегаты VI кангрэсу Камінтэрну т. т. ДОМБАЛЬ (×) і АДАМС (××).

Маленькая вакзальная плошча не магла зьмясьціць вялікай масы сустракаючых. З нецярпліваючым лічылі хвіліны да прыходу маскоўскага цягніка.

Але вось падышоў цягнік. З вагонаў вышлі нашы госьці. Гучнае радаснае ўра, пераплеценае гукамі Інтэрнацыяналу, доўга ня сьціхала. Госьці радасна аглядалі мора галоў, мора людзей, прасякнутых адными думкамі, адными мэтамі і імкненьнямі..

Ад акругкому партыі гасьцей прывітаў т. Славінскі.

У кароткіх словах ён падкрэсьліў значэньне працы УІ кангрэсу Камінтэрну. За ім выступіла наша госьця—мурынка т. Адамс, дэлегатка кангрэсу ад працоўных Злучаных Штатаў Амэрыкі. Яе ангельская мова была незразумела, але па міміцы і рухах адчувалася вера ў сьветлую будучыню, вера ў перамогу пралетарыяту ва ўсім сьвеце.

За ёй выступіў т. Домбаль.

Ён адзначыў становішча пралетарыяту ў Польшчы.

— Пан Пілсудзкі,—кажа т. Домбаль,—пратэстуе супроць прамовы Бухарына. Сацыял-дэмакраты і сацыял-фашысты пратэстуюць супроць пастановы кангрэсу. Але іх пратэсты не дапамогуць: камунізм запануе ва ўсім сьвеце.

Інтэрнацыянал зноў зьмяшаўся з гукамі ўра і воплескамі. Усё гэта гучэла, набратэрску.

Тав. Адамс, не зразумеўшая расейскае мовы, даведалася аб гэтых словах па вымове т. Домбаля і, паклаўшы паднесены ёй букет жывых кветак на стол, вітала прамову гучнымі воплескамі.

Пад гукі Інтэрнацыяналу госьці на аўтамабілі накіраваліся ў горад.

РАБОЧЫМ І СЯЛЯНАМ БЕЛАРУСІ.

Горача вітаю рабочых і сялян БССР—вольных будаўнікоў сацыялізму.

Рабочыя і сяляне Польшчы з гордасьцю глядзяць на адзіную сацыялістычную дзяржаву—СССР—апору сусьветнай рэвалюцыі.

Хутка прыдзе час, калі Захадняя і Ўсходняя Беларусь будзе адзінай савецкай; хутка прыдзе час, калі над усім сьветам будзе ўзьняты чырвоны сьцяг камунізму.

Няхай жыве Камінтэрн, пад кіраўніцтвам якога пралетарыят і працоўнае сялянства дойдуць да канчатковай перамогі—камунізму.

20-8—28 г. Т. ДОМБАЛЬ.

УСІМ СТАРШЫНЯМ ГАРСАВЕТАЎ.

Па паведамленьню Камітэту Садзейнічаньня грамадзкаму харчаваньню, большая частка пастаноў Савету Народных Камісараў па дакладу Беларабсэнцыі „Аб грамадзкім харчаваньні“ (апублікавана ў газ. «Савецкая Беларусь»—1928 г. № 93) не ажыцьцёўлена цалкам: шмат сталовых знаходзяцца ў антысанітарным становішчы; якасьць абедаў патрабуе палепшаньня; памяшканьні сталовых вельмі часта не адпавядаюць свайму прызначэньню і г. д. Гарадзкія Саветы спэцыяльных дакладаў Цэнтральнага Рабочага Кааператыву па грамадзкім харчаваньні на ставілі і канкрэтных дырэктыў па гэтым пытаньні не давалі. Такім чынам, такое важнае пытаньне, як грамадзкае харчаваньне, знаходзіцца ў нездавальняючым становішчы. Між тым запатрабаваньні да грамадзкага харчаваньня з боку шырокіх мас рабочых і служачых увесь час павялічваецца. Трэба рашуча зьмяніць такое становішча.

Савет Народных Камісараў даручае вам, як Старшыні Гарадзкога Савету, мець, як правіла, нагляд у вашым горадзе за выкананьнем адпаведных пастаноў па пытаньнях грамадзкага харчаваньня. Патрэбна заслухоўваць спэцыяльныя даклады, выдаваць дырэктывы, скарыстоўваць будаўнічы сэзон і зрабіць адпаведныя рамонты; загатовіць сэзонныя прадукты. Трэба зьнішчыць тыя недахопы, якія былі знойдзены Народным Камісарыятам Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі.

Адным словам, трэба ва ўсянім разе дабіцца пералому пастаноўкі пытаньня грамадзкага харчаваньня.

Больш кантролю над грамадзкім харчаваньнем, больш увагі і садзейнічаньня грамадзкаму харчаваньню.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. КАРКЛІН.

17 жніўня 1928 г.

Пэпэсы і праблема нацменшасьцяў.

(Выступленьне М. Недзялкоўскага на сацыялістычным кангрэсе ў Брусэлі 10 жніўня г. г.).

Сярод нацыянальных меншасьцяў Польшчы партыя польскіх сацыялістаў (пэпэсаў) карыстаецца нядобрай рэпутацыяй партыі, якая на словах абяцае бараніць правы нацменшасьцяў, а для некаторых з іх, якія маюць свае тэрыторыі, абяцае нават тэрытарыяльную аўтаномію, а на практыцы ніводнай з сваіх абяцанак ня выконвае. Правы для нацменшасьцяў пэпэсы прызнаюць—толькі тэарэтычна.

Скончыліся, скажам, выбары ў сойм, пэпэсы пракрычалі сваё, наабяцалі цэлыя горы прыемных рэчаў для нацменшасьцяў—і на гэтым канец.

На пэпэсаў раптам нападае нейкая неахвота, апатыя, і справы нацменшасьцяў імі зусім не парушаюцца.

Апошнімі часамі, дзякуючы паступоваму азнаямленьню замежных палітычных сфэр з бясспраўным палажэньнем нацменшасьцяў у Польшчы, а таксама і з тым, што польскія сацыялісты ня робяць ніякіх з свайго боку захадаў, каб паленшыць гэта палажэньне, замежныя сацыялістычныя колы зьвярнулі сваю ўвагу на паводзіны пэпэсаў па нацыянальным пытаньні ў слабе дома.

Якраз надышоў і кангрэс II Інтэрнацыяналу ў Брусэлі, да якога належыць і ППС.

Ня выступіць па пытаньнях польскіх нацменшасьцяў пэпэсам было немагчыма. І вось на трыбуну Другога Інтэрнацыяналу ўзышоў пэпэсавец Недзялкоўскі і амаль палову сваёй прамовы прысьвяціў справе нацыянальных меншасьцяў у Польшчы.

„Таварышы,—сказаў ён,—закранем яшчэ праблему нацыянальных меншасьцяў. Марсэльскі кангрэс сфармуляваў нашую праграму ў гэтай галіне. Справа тут ня ў іншым разуменьні, а ў выкананьні таго, што мы пастанавілі. На ўсходзе Эўропы адно сучаснае вызьвішча мае аграмаднае значэньне: уваскрашэньне (нацыянальнае адраджэньне) народаў украінскага і беларускага. Гэта ня ёсьць якоесьці «ўнутраное пытаньне» Польшчы або Савецкага Саюзу, гэта ёсьць факт, які адыграе гістарычную ролю. З тым большаю радасьцю вітаю ад імя польскай дэлегацыі пачаткі арганізацыі украінскіх сацыялістаў у Польшчы і ўступленьне ў II Інтэрнацыянал партыі украінскіх сацыялістаў-радыкалаў. Ніхто не патрафіць вырашыць пытаньні нацыянальных меншасьцяў, пакуль проці сацыялізму галоўнага народу будуць стаяць толькі нацыяналізмы меншасьцяў».

Такім чынам, вуснамі Недзялкоўскага пэпэсы, як быццам, прызналі, што 1) трэба выконваць пастановы Марсальската кангрэсу аб правох нацыянальных меншасьцяў, 2) нацыянальнае адраджэньне украінцаў і беларусаў мае аграмаднае значэньне і зьяўляецца фактам, які адыграе гістарычную ролю, 3) факт нацыянальнага араджэньня беларусаў і украінцаў не зьяўляецца якімсьці „ўнутраным пытаньнем“ Польшчы або Савецкага Саюзу, г. ё. Недзялкоўскі, відаць, прызнае права беларусаў і украінцаў на поўнае самавызначэньне.

Калі гэта так, дык як разумець заключны выкрутас п. Недзялкоўскага, што «ніхто не патрафіць вырашыць пытаньні нац. меншасьцяў, пакуль проці сацыялізму галоўнага народу будуць стаяць толькі нацыяналізмы меншасьцяў».

«Сацыялізм галоўнага народу»... «Нацыяналізм меншасьцяў»...

Ці-ж гэта ня чысьцейшы абсурд сьцьвярджаць, што «галоўны народ» Польшчы, г. ё. палякі, могуць быць уяўляемы, як сацыялісты, а меншасьці як нацыяналісты. Ці не наадварот?!

Ці не знаходзіцца галоўны народ Польшчы пад вельмі значным уплывам нацыяналістычных і нават шавіністычных ідэй? Аб гэтым сьведчаць шматлікія факты, як напрыклад: амаль ня поўная адсутнасьць кантакту пэпэсаў з украінскімі, беларускімі і яўрэйскімі сацыялістычнымі партыямі, што выклікаецца выключна тактыкай ППС, якая, як партыя «галоўнага народу», гэтага кантакту ня хоча навязваць.

Што гэта? Сацыялізм галоўнага народу? Ці нічым ня прыкрыты шавінізм?

Падругое—каб нават і было так, што проці сацыялізму «галоўнага народу» стаялі нацыяналізмы прыгнечаных нацменшасьцяў, дык няўжо-ж тады ня можна вырашыць пытаньняў нацменшасьцяў? Гэта ўжо абсалютная пэпэсаўская фальш, пры помачы якой яны хочуць перакінуць з сябе віну на прыдушаныя польскія нацменшасьці. Выходзіць так, быццам нацменшасьці Польшчы высоўваюць свой нацыяналізм знарок, каб і надалей быць пазбаўленымі правоў.

Гэта ўжо цынізм, якім на практыцы заўсёды адзначаюцца пэпэсы.

Дык вось, дзякуючы няшчырасьці пэпэсаўскай палітыкі па нацыянальным пытаньні, дзякуючы неахвоце і апатыі, якая нападае на пэпэсаў, калі пытаньні нацменшасьцяў іх не асабліва трывожаць, дзякуючы фальшываму асьвятленьню на міжнародным грунце пэпэсамі сваіх адносін да пытаньняў нацменшасьцяў — праблема нацыянальных меншасьцяў у Польшчы не вырашаецца.

Вырашыць нацыянальную праблему ў Польшчы зможа толькі камуністычная партыя, якая на практыцы ў СССР ужо даказала, што толькі яна гэтую праблему можа вырашыць.

Замежны.

На сходзе менскіх арганізацый.

Заля летняга тэатру саду «Прафінтэрн» запоўнена цалкам. Стаяць нават у бакавых праходах.

Падняўся занавес, усе ўстаюць і бурна вітаюць гасьцей-дэлегатаў VI кангрэсу Камінтэрну, якія знаходзяцца за сталом прэзыдыуму.

— Па даручэньню Цэнтральнага Камітэту Мопр'у ўрачысты сход Мопрскага актыву разам з прадстаўнікамі партыйных, прафэсыйных і інш. арганізацый г. Менску, а таксама з удзелам дэлегатаў VI кангрэсу Камінтэрну, дазвольце лічыць адчыненым,—абвяшчае сэкратар акругкому КП(б)Б т. Славінскі.

У кароткай прамове аб сучасным становішчы, якое пагражае небясьпекай новай сусьветнай вайны, т. Славінскі адзначыў надзвычайную ролю той працы, якую праводзіць цяпер VI кангрэс Камінтэрну.

— Калі ў 1914 г. перад сусьветнай вайной II Інтэрнацыянал сабраўся ў Базэлі і, каб перашкаджаць крывавай бойцы, ухваліў шэраг пастаноў, якія павінны былі выканаць сацыял-дэмакратычныя партыі розных краін, аж да нізьвяржэньня сваіх урадаў, дык гэтыя пастановы ня былі выкананы.

Сацыял дэмакратыя казала, што яна будзе выконваць гэтыя пастановы ў тых выпадках, калі іх краіны будуць нападаць. Але вайна ўсіх захапіла зьнянацку, згодніцкая сацыял-дэмакратыя не змагла ёй перашкодзіць, II-гі Інтэрнацыянал пацярпеў крах, а на яго месца пасьля імпэрыялістычнай бойні і Кастрычніка 1917 г. нарадзіўся III Камуністычны Інтэрнацыянал.

У сучасны момант, калі можна выбухнуць новая вайна, мы павінны ня толькі перашкаджаць узьнікненьню яе, але і абярнуць імпэрыялістычную вайну, калі яна здарыцца, у сусьветную рэвалюцыю.

Мы шчасьлівы бачыць у сябе дарагіх гасьцей-дэлегатаў УІ кангрэсу, якіх шчыра вітаюць працоўныя рабоча-сялянскія масы Беларусі,—заканчвае т. Славінскі.

* * *

Па абраньні прэзыдыуму пачынаюцца прывітаньні.

Тав. Адамс бурныя воплескі доўга не даюць гаварыць. На ангельскай мове прадстаўніца «нераўнапраўных», вітаючы прысутных і ў іх асобе ўсіх рабочых і сялян нашай савецкай краіны, у кароткіх рысах адзначыла тое цяжкае становішча, у якім знаходзяцца яе браты-нэгры. Да нераклады гэтай прамовы кожнаму прысутнаму, аднак, можна было дагадацца, аб чым апавядае прадстаўніца прыгнечаных, калі скрозь незразумелыя выразы праскаквалі словы: «лінча», «эксплёатацыя», „пралетарыят“, «Камуністычны Інтэрнацыянал» і г. д. У канцы т. Адамс заклікае ўсіх да змаганьня супроць новай пагрозы сусьветнай бойні, за вызваленьне прыгнечаных, за сусьветную рэвалюцыю.

— Ад камуністычнай партыі Польшчы, ад імя рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Украіны, ад імя камсамолу, ад імя Ланцуцкага, які зьняволены і кінуты ў турму, прывітаньне вам, рабочыя, сяляне, сялянкі і чырвонаармейцы Беларусі. Прывітаньне вам ад УІ кангрэсу Камінтэрну, які ў сучасны момант адбывае свае пасяджэньні ў Маскве—бацькаўшчыне сацыялізму,—перадае **т. Крулікоўскі.**

УІ кангрэс Камінтэрну працуе над задачамі, каб узьняць чырвоны штандар ва ўсім сьвеце. Кангрэс Камінтэрну абгаварвае пытаньні, каб абярнуць імпэрыялістычную вайну ў вайну грамадзянскую.

Спыняючыся на контр-рэвалюцыйнай ролі, якую будзе адыгрываць супроць Савецкага Саюзу буржуазная Польшча ў часе выпадку новай імпэрыялістычнай вайны, т. Крулікоўскі заклікае працоўных Беларусі моцна трымаць у руках зброю супроць нашага клясавага ворага.

На ўсе прывітаньні дэлегатаў УІ кангрэсу адказаў прадстаўнік рабочых Заходняй чыгункі **тав. Галаскок.** Ён запэўніў гасьцей, што працоўныя Беларусі разумеюць добра задачы клясавай барацьбы і ўсімі сродкамі пастараюцца бараніць сваю краіну, інтарэсы ўсіх працоўных і пад кіраўніцтвам штабу сусьветнага пралетарыяту III Камуністычнага Інтэрнацыяналу — яны перамогуць.

* * *

Позна ў 12 гадзін сход заслухаў даклад **тав. Домбаля** аб працы УІ кангрэсу Камінтэрну.

— Больш месяца працуе кангрэс. Ён падводзіць вынікі рэвалюцыйнаму руху апошніх часоў.

Спыняючыся на галоўных пытаньнях працы кангрэсу, тав. Домбаль кажа:

— Камінтэрн не гаворыць, што праз месяц або праз год будзе вайна. Ён дае ўказаньні, як рабіць перашкоды, як раскрываць падрыхтоўку імпэрыялістаў.

Нам патрэбна згуртаваньне і такія шляхі, якія-б пазбавілі нас ад паражэньня.

Над гэтым працуе Камінтэрн, зьвяртаючы асаблівую ўвагу кампартый на барацьбу з правымі плынямі, якія маюць цяпер для нас найбольшую небясьпеку.

Фашызм вядзе вялікую падрыхтоўку да вайны. Трэба раскрываць гэту імпэрыялістычную працу фашызму.

УІ кангрэс Камінтэрну даў задачы для кампартый у калёніях, падагуліўшы вопыт іх барацьбы, дае Камінтэрн пашырыў свой уплыў з часу У кангрэсу.

Была аднагалосна ўхвалена наступная рэзалюцыя:

Заслухаўшы прывітаньні дэлегатаў УІ кангрэсу Камінтэрну—прадстаўнікоў амэрыканскага, італьянскага і польскага пралетарыяту і даклад тав. Домбаля аб рабоце УІ кангрэсу, Мопраўскі актыў разам з прадстаўнікамі партыйных і прафэсыянальных арганізацый у ліку 1500 чал. пасылаюць сваё гарачае прывітаньне штабу сусьветнай рэвалюцыі—УІ кангрэсу Камінтэрну і ўяго асобе — с у с ь в е т н а м у пралетарыяту.

Сход лічыць, што цэнтральнай праблемай, якая стаіць перад пралетарыятам усіх краін, зьяўляецца падрыхтоўка новай сусьветнай бойні, вайны супроць Савецкага Саюзу, што падрыхтоўваюць акулы імпэрыялізму разам з сацыял-здраднікамі з II-га Інтэрнацыяналу. Рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі, якія стаяць на аванпосьце Савецкага Саюзу, пільна сочаць за ваеннымі падрыхтаваньнямі клясавага ворага па той бок мяжы і, будуючы сацыялістычную гаспадарку, моцна трымаюць стрэльбу ў руках, для таго, каб не апынуцца раптам пад нацыскам ворага.

Мы будзем і далей узмацняць нашу слаўную Чырвоную армію, шэрагі Асоавіяхіму і Мопру.

Мы ўпэўнены, што сусьветны пралетарыят ужо цяпер пры падрыхтоўцы вайны пойдзе па шляху, вызначаным Леніным, і зможа пад кіраўніцтвам Камінтэрну вайну імпэрыялістычную абярнуць у вайну грамадзянскую.

Адзіным пралетарскім фронтам, разам з прыгнечанымі калёніяльны народамі, мы ў наступных бойках скінем ярмо капіталізму і ўстанавім над усім сьветам чырвоны сьцяг працы.

Няхай жыве УІ кангрэс Камінтэрну!

Прэч лёкаяў буржуазеі, здраднікаў з II-га Інтэрнацыяналу!

Няхай жыве адзіны фронт пралетарыяту ўсіх краін і прыгнечаных калёніяльных народаў!

Няхай жыве сусьветная сацыялістычная рэвалюцыя!

Сярод менскіх пралетарыяў.

На курсах жанчын-членаў саветаў.

Дэлегаты наведалі Камвуз, дзе адбываюцца курсы жанчын—членаў саветаў. Дэлегатаў сялянкі спаткалі гучнымі воплескамі. На курсах выступалі ўсе дэлегаты; яны горача віталі лепшых прадстаўнікоў—жанчын-сялянак; яны іх віталі, як вольных жанчын, якія працуюць і прымаюць удзел у будаўніцтве поплеч з мужчынамі. Асаблівае ўражаньне на дэлегатаў зрабілі выступленьні дэлегатак на расейскай, яўрэйскай і польскай мовах. Дэлегаткі ў сваіх прамовах дзякавалі гасьцям і гаварылі, што жанчыны заўсёды гатовы дапамагчы агульнай справе, справе пралетарскай рэвалюцыі.

Выступіўшая курсантка на польскай мове сказала, што толькі пры савецкай уладзе можна мець вольнае жыцьцё, нацыянальную школу, нацыянальныя саветы. Такім чынам, мы куём сваё шчасьце і прымаем шчыры ўдзел у перабудове нашага жыцьця на сацыялістычны лад.

Пасьля курсанткі, якая гаварыла на польскай мове, выступіў тав. Крулікоўскі, які адказаў і на польскай і на яўрэйскай мовах.

Дэлегаты на чыгунцы.

Пасьля наведаньня курсаў жанчын—членаў саветаў дэлегаты падзяліліся на партыі. Першая партыя паехала на Заходні вакзал, а другая—на МББ. Тут дэлегаты навочна пазнаёміліся з жыцьцём савецкіх чыгуначнікаў і з тымі дасягненьнямі, якія мае наш чыгуначны транспарт.

На БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

110 тысяч руб. на палёгкі беднаце.

МАГІЛЕЎ, 19-8. На палёгкі беднаце па страхаваньні сёлета вызначана, як і ў мінулым годзе, 12 процантаў ад агульнай сумы налічаных страхавых плацяжоў. Гэта складае 109925 руб.

Паказаная сума разьмеркавана па райёнах з ваганьнем ад 10 да 15 процантаў сумы плацяжоў на кожны. Найбольшая лічба (9915 р.) прыпадае на Касьцюковіцкі райён, найменшая (4214 р.) —на Чачэвіцкі.

У сваю чаргу райвыканкомы правядуць разьмеркаваньне па сваіх сельсаветах.

Жывём калектыўным жыцьцём.

Ворша, 20-8. Сельска-гаспадарчая арцель „Новае жыцьцё“, (Мсьціслаўшчына) арганізавалася ў 1925 г. С пачатку калектыўнага жыцьця арцель сустрэла шмат цяжкасьцяў, бо зямля папалася з-пад лесу, прышлося выкарчоўваць пні, асушаць балоты і г. д.

У сучасны момант сельская гаспадарка арцелі абсталявана добра. Маецца цэлы шэраг новых будынкаў. Наладжана досыць добра малочная гаспадарка, сьць 35 малочных пародзістых кароў. Ёсьць два добрых пародзістых вытворцы. Набыт увесь неабходны малочны інвэнтар.

Арцель зямляўпарадкавана, заведзены 9-ціпалёвы севазварот з спэцыяльным засевам кораньплодаў і травасеяньня.

Падатак здаў да тэрміну.

ВІЦЕБСК, 20-8. Селянін в. Высачаны таго-ж р-ну і с-савету **Салаўёў Сьцяпан Рыгораў** *12-га жніўня* **атрымаў акладны ліст і ў той-жа дзень першы цалкам унёс с. г. падатак.**

1200 р. у карысьць Мопру.

БАБРУЙСК, 19-8. За першую палову жніўня ў акруговы камітэт Мопру паступіла 1200 руб. сабраных ячэйкамі Мопру у карысьць палітвязьняў капіталістычных турмаў.

Вырубаюць сады.

ВОРША, 18-8. У Горацкай Камунальнай Гаспадарцы людзі нязвычайныя, людзі з фокусамі. Раней рагатыя казлы поедалі сады ў Горках, а зараз з партфэлямі з Камунальнай Гаспадарні. Для пабудовы новых дамоў яны вырубаюць сады, прыносячыя вялікі прыбытак. Месца для дамоў у садох аддаецца свакам. Ад усёй гэтай працы дзяржава мае шкоды 525 руб. пры „нэйтральнай“ ацэнцы аўтарытэтнай камісіі. Трэба горацкіх „архітэктараў“ крыху стрымаць.

15 тыс. кубамэтраў торфу.

БАБРУЙСК, 19-8. Мэліярацыйнымі таварыствамі акругі на працягу летняга часу будзе здабыта 18 тысяч кубічных мэтраў торфу. Да бягучага часу ўжо здабыта 15 тыс. куб. мэтраў. Здабыча, супроць мінулага году, павялічылася ў 9 разоў.

Тарфяны завод на балоце.

ГОРКІ, 18-8. На Чапяліновім балоце, Горацкага райёну, другов лета працуе тарфяны завод. Рабочых на заводзе 60 чалавек. Механізацыя заводу складаецца з 40-сілавога лёкамабілю і аднаго прэса.

Уборка жыта ў разгары.

У Крупіцкім сельсавеце ўборка жыта распачалася прыблізна з 1-га жніўня. Надвор'е для ўборкі ня надта спрыяючае, хоць з пачатку было нішто. У гэтым годзе, у параўнаньні з мінулым, жыта пасьпявае на два тыдні пазьней, але рост дало здавальняючы і ўраджайнасьць павінна быць сярэдняй. Шмат сялянства ўжо маюць сьвежы сёлетні хлеб. У зьвязку з паяўленьнем сьвежага хлеба цана на апошні значна зьнізілася. У параўнаньні з мінулым годам яравыя пасевы сёлета значна лепшыя, асабліва прыкмячаецца рост аўсу і бульбы. Нагул, яравыя пасевы зараз знаходзяцца ў самым росьце і пасьпеюць пазьней як у мінулым годзе. Па ходу росту яравых пасеваў відаць, што калі ня будзе стыхійнага ліха, ураджай павінен быць вышэй сярэднага.

В. Дуб. Слабада, Меничына.

Сяляне—на курорты.

ГОМЕЛЬ, 20-8. Сёлета акрздраву прадастаўлена 14 месц для пасылкі сялян на курорты. З гэтай лічбы 7 сялян ужо пасланы, 15 верасьня ў Ліваадыю накіроўваюцца яшчэ 5 сялян і 1 настрычніка двое астатніх.

Кватэры для рабочых.

Ворша, 20-8. Камгас пастанавіў распачаць сёлета ў г. Воршы пабудову 3-хпавярховага каменнага будынку для рабочых.

Будынак разьлічан на 16 кватэр і будзе каштаваць каля 145000 руб.

Новае пераможа.

У вёсцы Балотні, Журавіцкага райёну, сёлета зарганізаваліся тры калектывы.

Два калектывы—дробныя: у 6 і 7 двароў. Трэці калектыў (імя „Леніна“) даволі буйны—120 гэктараў зямлі, 17 сямей. У карыстаньне гэтага калгасу перададзен сад плошчаю ў 15 гэктараў. Ужо складзе яго—беднякі і ўдовы. Заможнікі імкнуліся перашкодзіць стварэньню калгасу. Падпусьцілі нават чырвонага пэўна старшыні праўленьня калектыву тав. Боэіку, усе будынкі яго згарэлі. Так не спадабаўся ім калектыў. **Але-ж калектывісты кажуць:**

— Новыя шляхі прасачваюцца ў сельскую гаспадарку, яны перамогуць...

Пабудова клюбу пры заводзе „Камінтэрн“.

Бабруйск, 20-8. У бягучым годзе пры шкляным заводзе «Камінтэрн» пачне будавацца клюб. Будынак клюбу —двухпавярховы. Пабудова гэтага клюбу будзе каштаваць каля 40000 руб. і будзе сёлета закончана.

45000 руб. на с.-гасп. машыны.

Полацак, 20-8. Акруговае сельска-гаспадарчае крэдытнае таварыства атрымала з Менску 45 тысяч рублёў спэцыяльна на крэдытаваньне сялянства да пасеўнай кампаніі. Сродкі адпушчаны на набыцьцё сельска-гаспадарчых машын.

На барацьбу з дзіцячай бясспрытульнасьцю.

Бабруйск, 20-8. На барацьбу з дзіцячай бясспрытульнасьцю каштарыс акруговай дзіцячай камісіі прадугледжвае выдаткі ў суме 50 тыс. руб. Паміж іншых мерапрыёмстваў прадугледжваецца арганізацыя 7 майстэрняў, дзіцячых яслёў на 25 дзяцей і г. д.

Масты пабудованы.

Самаабкладаньне ў нашай вёсцы праведзена. На сабраныя ад самаабкладаньня грошы агульны сход пастанавіў пабудаваць цэмантныя студні, пярунаадводы і дарогі. Але ня ўсе пастановы праводзяцца ў жыцьцё. Пярунаадводы і масты пабудаваны, а цэмантных студняў яшчэ няма.

Уваравіцкі р., Гомельшчына.

Будуем школы.

Усяго па райёну самаабкладаньне праведзена на суму 24829 руб. 75 к. У тым ліку працай 2184 руб. 80 к. З адзначанае сумы на пабудову школ прызначана 2858 руб. 85 к., на рамонт іх 1604 руб. 22 к. На пажарную ахову 3866 руб. 55 к., на зямляўпарадкаваньне 1320 руб. і на шляхавае будаўніцтва грашыма 4138 руб. 43 к. і працай сялян на 2184 руб. 80 кап. На адчыненьне мэдпунктаў прызначана 4778 руб. 14 к., на культасьветную працу 994 руб. 17 к., на пабудову студняў 962 руб. 68 к. і на іншыя патрэбы 2121 руб. 80 к. **Па ўсіх адзначаных галінах ужо распачата праца. Адчынены два мэдпункты ў вёсках Бытча і Зачысуе. Закуплена 8 пажарных машын з усімі прыладамі. Пабудована пажарнае дэпо ў вёсцы Чарнявіцах. Пабудована 5 новых вялікіх мастоў, зрапарованы шлях ад м. Стахава на Барысаў, зроблены насыпы па бакох шляху высажаны дрэвы. Будуецца новая школа ў вёсцы В. Нечнавічы, на якую сяляне сабралі сваіх грошай 450 руб. Зроблена поўнае абсталяваньне Лозінскай польскай школы, адбудован новы хлеў і студня. Заканчваецца рамонт Краснадубаўскай школы, распачат рамонт Горскай школы. Заканчваецца грунтоўны рамонт Зембінскай больніцы.** Першы прыклад будаўніцтва за кошт самаабкладаньня правёў В. Стахаўскі сельсавет. Сяляне гэтай вёскі правялі самаабкладаньне на пабудову школы на 35 проц., але беднята на гэтым не застанавіліся. Пад кіраўніцтвам бедняка сябра сельсавету тав. Каласоўскага беднята горача ўзялася за пабудову шляху, які ідзе праз вёску Стахаў. **У сучасны момант, там, дзе было вечнае балота, пароты канавы і красуецца новы пабудаваны шлях.**

Трэба сказаць, што беднята прымае актыўны ўдзел у нашым сацыялістычным будаўніцтве. У гэтым годзе будзе пабудован цэлы шэраг новых школ, шляхоў і мастоў. Вясковае будаўніцтва ў нашым райёне з кожным годам пашыраецца.

А. Станкевіч.

Барысаў.

НА МІЖНАРОДНАЙ ВЫСТАЎЦЫ ДРУКУ Ў КЁЛЬНЕ*).

Скончыўшы агляд усіх аддзелаў і экспанатаў савецкага павільёну, я быў ня мала зьдзіўлены, што аддзелу Беларускай Савецкай Рэспублікі нідзе няма. Прашоў яшчэ раз увесь павільён, пільна прыглядаючыся да самых маленькіх экспанатаў—няма! Зьвярнуўся да загадчыкаў павільёну. Адзін з іх паказаў мне сходы (якіх я раней ня бачыў), зрабіў гэст рукой угару, сказаў: «вунь там ваша Беларусь».

Узьлез я на «антрэсолі», зірнуў, і гарачая фарба сораму і крыўды заліла мой твар.

На вузенькім століку абы як паложаны дзесяць беларускіх кніжак, а вад імі проста на дошкі століка наклеены нейкія выгарэлыя ад часу фатаграфіі. Тут зусім мала сьвятла, і каб убачыць, што ёсьць на гэтых фатаграфіях, трэба амаль носам даткнуцца да іх. Зьверху над столікам з кнігамі вісіць груба намалёваная на кальцы схэматычная карта БССР, пры чым на ёй няма нямецкага надпісу, а ёсьць толькі чатыры чорныя літары „БССР“, з якіх ніхто з чужаземцаў нічога не зразумее. Мала таго, карта гэта „няма“, бо на ёй стаяць чырвоныя кружочкі-гарады, але назвы гарадоў не падпісаны. З боку ад століка і карты стаіць слупок з палічкамі, на якіх пастаўлены выданьні Інбелкульту (5-10 кніжак). Усё.

І ўсё гэта «усё» даволі густа пакрыта пылам, бо, як відаць, прыбіральшчыкі, якія кожны дзень абмятаюць пыл з экспанатаў, не фатыгуюцца, каб узлазіць на „антрэсолі“, куды, праўду кажучы, публіка рэдка заглядвае.

Дзівіць і тое, што нават гэты мізэрны лік кніжных экспанатаў мае зусім выпадковы характар. Тут ёсьць экспанат, наведама якім чынам трапіўшы ў Кёльн. Наўважлівасьць да беларускіх экспанатаў з боку загадчыкаў савецкага павільёну можна ілюстраваць хоць бы тым фактам, што на століку паміж беларускіх кніг ляжалі туркменскія, а беларуская кніга («Прысады» Ц. Гартнага) ляжала на стале ўзбекістанскіх выданьняў...

Яшчэ ў сьнежні 27 году пачалася па ўсяму Саюзу падрыхтоўка да Кёльнскай выстаўкі.

Менск атрымаў з Масквы вялізарную праграму-інструкцыю. Склікаліся не адзін, раз камісіі з прадстаўнікоў розных культурна-асьветных установаў, абгаварвалі гэту праграму, горача спрачаліся і г. д. Урэшце, узлажылі ўсю падрыхтоўку выставачных экспанатаў на Беларускую Дзяржаўную Кніжную Палату. Тав. Сіманоўскі з уласьцівымі яму замілаваньнем і веданьнем гэтае справы зьбіраў экспанаты, дзе толькі было магчыма. Жадаючы як мага паўней прадставіць гісторыю разьвіцьця і рост беларускага друку, т. Сіманоўскі здабываў экспанаты-унікумы ў розных рэдакцыях і нават прыватных асоб. Бывалі выпадкі, калі ўласьнікі гэтых кніжных унікумаў ніяк не згаджаліся выпусьціць з рук рэдкае кнігі або часопісі, але, уступаючы просьбам і агрумэнтам, што гэта для „міжнароднае выстаўкі“, аддавалі пад самыя пэўныя гарантыі загадчыка Дзяржаўнай Кніжнай Палаты.

У выніку доўгае працы было сабрана болей 300 экспанатаў, сярод якіх былі, напрыклад, здымкі з газэтлістовак К. Каліноўскага (1864 г.). Грамата ўраду аб 400-годзьдзі беларускага друку, граматы ўраду аб наданьні Я. Купале і Я. Коласу годнасьці народных паэтаў рэспублікі, былі ўзоры ўсіх старых беларускіх газэт, часопісаў, кніг, былі карты, статыстычныя дыяграмы, узоры прэміраваных насьценных газэт, фатаграфічныя здымкі краявідаў і тыпаў Беларусі, былі ўзоры ўсіх часопісаў, кніг, і г. д.

У лютым месяцы экспанаты былі адасланы ў Маскву, і нашае прадстаўніцтва афіцыяльна паведаміла Беларускую Кніжную Палату, што экспанаты атрыманы поўнасьцю, у добрым выглядзе і прызнаны выставачным камітэтам надта ўдалымі. Аб далейшым лёсе беларускіх экспанатаў ніхто (здаецца) нічога ня ведае. Вядома адно—на міжнародную выстаўку друку ў Кёльне яны ня трапілі. Ведаючы, як мы паважна рыхтаваліся да Кёльнскае выстаўкі, і ўбачыўшы там на месцы нейкі мізэрны цёмны куток на антрэсолях з дзес

2-я пазыка індустрыялізацыі.

У ГОМЕЛІ ПАДПІСКА ДАЛА 200.000 РУБ.

ГОМЕЛЬ, 20-8. Падпіска на пазыку праходзіць жвава. Многія рабочыя падпісваюцца ў шмат разоў больш, як на месячны заработак.

Асабліва актыўна праходзіць падпіска на чыгунцы. Выкладчык чыгуначнай школы Акалоўскі падпісаўся на 500 руб. На фабрыцы „Везувий" за два дні сума падпіскі дасягнула 23.000 руб. На фабрыцы «Днепр» па пяці цэхах падпіска дала 11.100 руб. На фабрыцы «Герой труда» арганізаваны цэхавыя камісіі садзейнічаньня пазыцы.

Саматужна-прамысловы саюз абвясьціў конкурс на лепшае ссуда-ашчаднае таварыства па рэалізацыі пазыкі.

На 18-га жніўня сума падпіскі дасягнула звыш 200 тысяч рублёў, што складае 25 проц. заданьня

Сяляне падпісваюцца на пазыку.

Асіпавічы, 20-8. *У вёсцы Ражнетава на сходзе сялян бядняк Сяліцкі сказаў: „Нам патрэбна ісьці разам з рабочымі, бо агульнымі сіламі мы хутчэй узмацнім сваю гаспадарку. Рабочыя ўжо падпісваюцца на пазыку, трэба і нам ад іх не адставаць. Я першы падпісваюся на 10 руб. і заклікаю другіх падпісацца».*

Тут-жа на сходзе падпісаліся і другія сяляне на 55 руб.

Камсамольцы падпісаліся на 10.000 руб.

ВІЦЕБСК, 20-8. У першы дзень падпіскі на 2-ую пазыку індустрыялізацыі калектыў ЛКСМБ мэталістаў сабраў падпіскі на пазыку на 10000 руб. У сярэднім падпіска перавышае 150 проц. месячнага заработку камсамольцаў. Ёсьць камсамольцы, якія падпісаліся на 250 руб.

НА 1250 РУБ.

ВІЦЕБСК, 20-8. За 10 хвілін 20 рабочых акулярнай фабрыкі аптычнага цэху падпісаліся на 1250 руб., што ў сярэднім складае месячны заработак. Трэба сказаць, што фабком яшчэ ніякай растлумачальнай кампаніі не вядзе, камісія садзейнічаньня таксама не раскачалася.

Магілеўцы раскачваюцца.

МАГІЛЕЎ, 20-8. Падпіска на пазыку індустрыялізацыі пачынае разгортвацца. Так працаўнікі аксрсельсаюзу і малочнага саюзу падпісаліся на 4589 руб., калектыў кірпча—на 2600 руб., што складае 100 проц. месячнай пэнсіі, Групком № 1 саюзу мэдсанпрацы на 1-ю пазыку індустрыялізацыі набраў падпіскі на 360 руб., а на 2-ю пазыку ўжо сабрана падпіскі на 1300 руб. і мяркуюць давесьці не да 2000 руб. Зьвесткі з райёнаў сьведчаць аб тым, што і ў апошніх разгортваецца праца па падпіскі.

Працоўныя рэалізуюць усю пазыку.

ВОРША, 20-8. Чыгуначнікі станцыі Ворша МБВ чыг. ужо сабралі падпіскі на 2-ую пазыку індустрыялізацыі на 3685 р.

Сход рабочых чыгуначнікаў выказаўся за тое, каб кантрольная сума для Аршаншчыны ў 485.000 руб. была рэалізавана выключна сярод працоўных, бо індустрыялізацыя краіны,—гэта справа рабочых і сялян і таму 55,000 руб. з гэтай сумы, вызначаных для рэалізацыі на вольным рынку, павінны быць рэалізаваны сярод працоўных.

Праца распачалася.

ЛІОЗНА, 20-8. Ліозьненскі райён ужо распачаў працу па распаўсюджваньні 2-ой пазыкі індустрыялізацыі. Працаўнікі райвыканкому падпісаліся на месячную пэнсію, што складае 1002 руб. Працаўнікі раймілыцыі—на 500 руб. Падпіска па райёну дала ўжо 5000 руб.

Ужо падпісаліся на 212425 руб.

БАБРУЙСК, 20-8. Водлуг даных гарадзкой камісіі садзейнічаньня рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі, папярэдняя падпіска на гор. Бабруйску дасягнула ўжо 212425 руб. Ёсьць усе падставы меркаваць, што заданьне будзе выканана на ўсе 100 проц.

Стралкі і пазыка.

ЖЛОБІН, 20-8. Стралкі і каманды склад №-га райёну аховы ст. Жлобін за 2 дні падпісаліся на 4500 руб, Стралок ПАДОЛЬСКІ падпісаўся на 225 руб.

Падпісаліся і выклікюць іншыя саюзы.

ДРЫБІНА, 20-8. Члены прафсаюзу Дрыбінскага райёну падпісаліся на поўны месячны заработак на агульную суму ў 2400 руб. Адначасова яны выклікаюць і іншыя саюзы Дрыбіншчыны зрабіць тое самае.

Першы дзень даў 1.500 р.

Першы дзень падпіскі на пазыку сярод служачых Нар. Ком. Унутраных Спраў БССР даў 1500 руб. Падпісаліся 15 чал. Падпіска працягваецца і мае быць даведзена да 5000 руб.

Жыцьцё і праца асьветніка.

За нармальны навучальны год.

Закранутае пытаньне ня новае: аб ім ужо ня мала гаварыў друк, але, ня гледзячы на гэта, навучальны год у нашай вясковай школе і да гэтага часу патрабуе лепшага. Фактычна навучальны год у вясковай школе цягнецца якіх-небудзь 5 месяцаў, максімум 6, прычым школа на працягу першых трох месяцаў папаўняецца і, такім чынам, ёсьць вучні, якія наведваюць школу ня больш 3 месяцаў. К чаму прыводзіць такая настаноўка справы? Перш за ўсё, дзякуючы несваечасоваму зьяўленьню дзяцей у школу, павялічваецца лік другагоднікаў, працацца нявытворча сродкі на народную асьвету, што адцягвае тэрмін усеагульнага навучаньня, цягне за сабою астаўленьне вучнямі школы раней часу. Гэта парушае нармальны ход школьнага жыцьця, падрывае аўтарытэт апошняй і г. д.

Як бачым, пытаньне досыць сур'ёзнае, пытаньне, якое патрабуе рашучай і неадкладнай чыннасьці. У першую чаргу трэба разьбіць стары традыцыйны погляд насельніцтва на навуку, раўналежна з гэтым трэба выкарчаваць думку, што незачым дзіця больш вучыць, раз яно асіліла грамату, гэта значыць—можа расьпісацца і інш. Да таго часу, пакуль гэта традыцыя будзе жыць, патуль такія зьявы, як: другагодніцтва, астаўленьне без пары школы вучнямі, напісьменнасьць падрастаючага пакаленьня, рэлігійнасьць, забабоны, варажба таксама будуць жыць і будуць класьці свой адбітак як на твар школы, так і на твар вёскі.

Што-ж застаецца рабіць? І як выйсьці з гэтага становішча? Пытаньне гэта трэба ставіць на надыходзячых настаўніцкіх канфэрэнцыях і не апошнім, а першым, прычым для абгаварэньня яго не шкадаваць часу і тыя ці іншыя пастановы адносна гэтага праводзіць у жыцьцё. Ніякія перашкоды не павінны спыняць працы ў гэтым напрамку. Вожнаму настаўніку на месцы дапаможа ў гэтым і камсамол і сельсавет; варта толькі настаўніцтву ўзяцца за гэту справу сур'ёзьней і больш рашуча. Праўда, праца гэта ня лёгкая, патрабуе правільнага падыходу, такту, энэргіі, настойлівасьці і г.д., але гэта ня значыць, што мы перад гэтым павінны спыняцца.

Многія скажуць (нават казалі), што задачу гэту цяжка, а то і немагчыма разьвязаць у сучасных вясковых умовах. Згадзіцца можна толькі з тым, што праца—цяжкая, а што датычыцца немагчымасьці яе выкананьня, дык згаджацца ня прыходзіцца: робячы—што-небудзь ды зробіш. Узяўшыся шчыра за працу і павёўшы яе сярод вучняў і насельніцтва—і не наскокам, а сыстэматычна,—можам тады сьмела быць упэўнены, што праца наша дасьць патрэбны нам плод. Ясна, што за год ці два мы ня ўсілах зьнішчыць гэту ненармальнасьць, але паступова дасягнем мэты, якую паставілі перад сабою.

Вясковая школа павінна шукаць шляхоў, якія-б дапамаглі выйсьці з гэтага становішча; школа павінна цесна зьвязацца з насельніцтвам, з бацькамі вучняў, яна павінна дабіцца таго, каб бацькі не затрымлівалі дзяцей дома ні ў пачатку, ні ў канцы навучальнага году. Добра пастаўленая праца з насельніцтвам забясьпечыць школе своечасовы пачатак і канец навучальнага году, а таксама—безперабойнае наведваньне вучнямі школы ў працягу ўсяго году, што, вядома, пазбавіць школу ад такога ненармальнага зьявішча, як астаўленьне на другі год адной чвэрткі, а то і трэці вучняў.

Такім чынам, другагодніцтва скароціцца да мінімуму, школа будзе выпускаць са сваіх сьцен больш як вучняў, а таксама і больш пісьменных, што прыблізіць нас да ўсеагульнага навучаньня і ўзьніме аўтарытэт школы.

Антон Лёсік.

Вопыт працы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

(Слуцкі райён).

Мы маем досыць вялікі вопыт працы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Кепска адно, што на месцах недастаткова падлічваецца гэты вопыт і мы яго не бяром як адпраўную точку для разгортваньня далейшай працы.

Уся праца праходзіла звычайна так. Па кантарысу адпускаюцца грошы, набіраецца кантынгент няпісьменных і праводзіцца праца.

Ніякае грамадзкасьці вакол гэтае надзвычайна важнае справы не складалася. Зачастую адпушчаныя сродкі на лікбез не скарыстоўваліся па прызначэньню, а то і зусім заставаліся нявыкарыстанымі.

Па Слуцкім райёне праца па ліквідэзу ў мінулым годзе была сарвана. Намечана было прапусьціць праз ліквпункты 289 чал., на што мелася 860 руб., а прапушчана было за зіму 91 чал. і выкарыстана 273 руб., рэшта сродкаў засталіся нявыкарыстанымі.

На гораду справа абстаяла крыху лепш у сэнсе абхвату людзей ліквпунктамі і прыцягненьня грамадзкасьці да гэтае справы. Два ліквпункты працавалі на сродкі таварыства «Прэч Няпісьменнасьць». Дрэнна толькі тое, што значная частка ліквпунктаў выкарыстана была на працы з малапісьменнымі.

Клаўдзацыя і прафсаюзы да гэтае працы належна ня прыцягваліся.

Па прафсаюзах, дзе значны процант няпісьменных, мы назіраем такі малюнак, што сродкі культфонду трацацца на закупку рознае літаратуры, у бібліятэках гэтых саюзаў можна знайсьці «Капітал» Карла Маркса, творы Леніна і гэтак далей. Усё гэта базуюўна добра, бяда толькі ў тым, што да 40 проц. у гэтых саюзах няпісьменных, а 80 проц. ня могуць чытаць гэтых твораў.

Другім недахопам зьяўляецца тое, што мы ня знаем усяго кантынгенту няпісьменных, у нас няма сталага вучоту няпісьменнасьці.

Падлічваючы гэты вопыт, нам неабходна рашуча паставіць пытаньне аб пераломе ў гэтай працы, дзеля чаго зьвярнуць увагу на наступнае:

зараз-жа заняцца вучотам няпісьменных, асабліва тых узростаў, якія павінны ліквідаваць няпісьменнасьць і ў адпаведнасьці вучоту будаваць плян працы, а гэтага на месцах няма.

Па лініі прафсаюзаў — усклясьці больш адказнасьці за працу ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, на што абярнуць значную частку культфондаў, бо бюджэтных сродкаў не хапае для гэтае працы.

Катэгарычна паставіць пытаньне аб выкананьні пастаноў партыйных і савецкіх арганізацый па ажыўленьні дзейнасьці т-ва «ПрэчНяпісьменнасьць», усклаўшы на яго некаторы процант выкананьня пляну працы па ліквбезу.

А. Крыцкі.

І прафорганы вінаваты.

За апошнія некалькі месяцаў у цэлым шэрагу культ-асьветных установаў (сельска-гаспадарчых тэхнікумах, школах 7-хгодках, дзіцячых калёніях) выяўлена значная безгаспадарчасьць. То несваечасова праведзена пасяўная кампанія і ўборка ўраджаю, то дрэнна зроблены рамонты памяшканьняў, то сабраныя прадукты, дзякуючы недагляду, гніюць і г. д.

Хто вінават у падобнай безгаспадарчасьці? Рэч вядома, што ў першую чаргу вінаваты кіраўнікі ўстановамі, на якіх усклядзена адказнасьць за належную пастаноўку як педагагічнай, так і гаспадарчай справы ў установе. Кіраўнікі ўстановамі за дапушчэньне безгаспадарчасьці ў адпаведнасьці з іх віною будуць пакараны. Але адною справаю пакараньня выжыць безгаспадарчасьць нельга. Тут патрэбны іншыя меры і ў першую чаргу меры папярэджаньня безгаспадарчасьці.

Хто-ж павінен гэтаю справаю займацца? Зразумела, што органы НКА, саюзу працасьветы, з прыцягненьнем шырокіх мас непасрэдных радавых працаўнікоў установаў. Да апошняга часу як органы НКА, так і саюзу мала ўлучалі ўвагі справе гаспадарчай.

Наданьне значных правоў заг. установамі ў сэнсе адміністрацыйна-гаспадарчым стварыла такія ўмовы, што прадстаўнікі органаў НКА пры інспэктыраваньні і інструктаваньні культ-асьветных установаў галоўную ўвагу зьвяртаюць на пастаноўку мэтадычнай справы, пакідаючы без належнай увагі гаспадарчы бок установы. Такім чынам адсутнасьць належнага кантролю над пастаноўкаю гаспадарчага боку ўстановы сама па сабе стварае стымул безгаспадарчасьці.

Трэба абавязкова зьмяніць сыстэму абгляду культ-асьветных установаў, трэба абглядаць не павярхоўна, а ўсебакова, грунтоўна, прыцягваючы да вызяўленьня недахватаў прафорганы і супрацоўнікаў данай установы.

Калі ў безгаспадарчасьці вінаваты кіраўнікі ўстановамі і органы НКА, якія ня выявілі своечасова гэтую безгаспадарчасьць, дык значная доля віны такама падае і на прафорганы. Што зрабілі прафорганы, каб папярэдзіць безгаспадарчасьць? Дзе былі і што рабілі вытворчыя камісіі? Чаму прафорганы не паставілі своечасова дакладаў кіраўнікоў установаў на агульных сходах, не прыцягнулі да вызяўленьня недахватаў усіх супрацоўнікаў і не паведамілі адпаведныя органы аб гэтым? Значыць, прафорганы ці спалі і нічога ня бачылі, ці калі бачылі, дык рабілі крымінальныя ўчынкі, не паведамляючы аб безгаспадарчасьці адпаведныя ўстановы.

Задачы падняцьця вытворчасьці, рацыяналізацыі працы, мэтазгоднага скарыстаньня сродкаў ня толькі павінна вырашаць адміністрацыя, але ў значнай ступені гэта задачы і саюзныя. Праз эканомкамісіі, вытворчыя нарады, сходы чырвонаю ніткаю павінна праходзіць гэта праца. У гэту працу павінны быць упягнуты самыя шырокія колы радавых працаўнікоў.

Я. М.

Гомельскі дом працасьветы.

Сярод іншых дамоў працасьветы на Беларусі, з боку матар'яльнага забясьпечаньня, гомельскі займае выдатнае месца. Добрае 2-хпавярховае памяшканьне, парадак у інтэрнатах, бібліятэцы, чытальні—усё гэта робіць прыемнае ўражаньне. Месячны бюджэт узрос на 701 руб., з якіх акрэвыканком дае 158 руб., акр. аддзел працасьветы 200 руб., а рэшта з адлічэньняў узносаў гарадзкіх масцкомаў. Бібліятэка мае 12 тысяч экземпляраў. Беларуская літаратура ў ходу і некаторыя книжкі нават і аднаго дню не ляжаць у бібліятэцы (напрыклад: «Сокі палінны» і творы М. Зарэнка-га), але разьбіраюцца яны не гарадзкім, а вясковым настаўніцтвам.

На сёньняшні дзень пры доме налічваецца 6 гурткоў. Заслугоўвае ўвагі гурток „Мэдыцынскіх сёстраў", у якім было 25 жанчын. Гурток вывучаў тэорыю гэтай галіны, а таксама і практычную дапамогу на выпадак патрэбы. Была зроблена праверка ўсіх слухачоў гуртку, пасьля якой выпушчана 21 мэдыцынская сястра. Вайсковы гурток працаваў слаба і праца яго складалася толькі з таго, што сябры прымалі ўдзел у камсамольскім паходзе.

Беларусізацыя дому зусім нязначная. Фактычная і грунтоўная праца домам вядзецца сярод гарадзкіх настаўнікаў, і калі пры доме маецца 2 літаратурныя гурткі, дык тэмаю працы была выключна расейская літаратура. У сярэдзіне памяшканьне нічога не наказвае, што гэта памяшканьне працасьветы Беларусі: лёзунгі, плякаты, заўвагі, абвесткі і г. д.—усё на расейскай мове.

Кіраўнікам неабходна на гэта зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Б. Ржавуцкі.

Аб групавым садоўніцтве ў БССР.

Беларусь мае амаль усе ўмовы для пасьпяховага разьвіцьця садоўніцтва.

Мяккі клімат, дазваляючы разводзіць у садох больш каштоўных асартыманты, наліча значных плошчаў лёгкіх суглінкавых глеб, на якіх добра разьвіваюцца пладовыя насажденьні, значная колькасьць аладкаў, высокая працаёмкасьць садовых культур і прыбытковасьць іх, разьвітая сетка чыгунак і танных вядзяных шляхоў і інш.—усё гэта стварае вельмі спрыяючыя ўмовы для пасьпяховага разьвіцьця садоўніцтва ў Беларусі як адной з найбольш каштоўных інтэнсыўных галін сельскай гаспадаркі.

У сучасны момант ва Беларусі маецца пад пладовымі насажденьнямі 25 тыс. гэкт., з якіх 21 тыс. гэкт. з дарослымі насажденьнямі, даючымі поўныя ўраджаі, і 4 тыс. гэкт. маладых садоў, толькі пачынаючых пладанашэньне.

Па катэгорыях землякарыстаньняў сучасная садовая плошча падзяляецца на дзьве групы: сады на землях сялянскіх гаспадарак—14.500 гэкт. (58 проц.) і сады ў савгасах, калгасах і садова-гародніх гаспадарках—10.500 гэкт. (42 пр.).

Ураджайнасьць садоў па ўсёй БССР дасягнула ўжо даваеннага ўзроўню, складаючы ў сярэднім 333 пуд. на гэктар, адкуль штогодні валавы збор садавіны са ўсёй плошчы пладаноснага саду (з 21 тыс. гэкт.)—7 мілёнаў пудоў. Прадукцыя гэта разьмяркоўваецца так: спажываецца насельніцтвам вёсак тры з паловай мілёнаў пуд., прадаецца на мясцовым рынку—паўтара мілёны пуд. і вывозіцца за межы Беларусі, галоўным чынам, у Ленінград і на Украіну—два мілёны пуд.

Удзельная вага садоўніцтва Беларусі ў агульнай сыстэме сельскай гаспадаркі пакуль яшчэ нязначная з прычыны малых разьмераў яго, але па таварнасьці яно стаіць вышэй за ўсе іншыя галіны сельскай гаспадаркі.

Разьвіцьцё садоўніцтва Беларусі да гэтага часу ішло вельмі павольна, за настачай насадачнага матар'ялу, але зараз мы выходзім з гэтага крызісу. Зараз на Беларусі маецца досыць значная сетка пладовых выхавальнікаў. Першы водпуск сажанцаў з выхавальнікаў чакаецца ўвосень гэтага году. Усяго сёлета будзе адпушчана 250-300 тыс. шт. сажанцаў, а праз 3 гады штогодні водпуск іх будзе даведзен да аднаго мілёну штук. Лічачы ў сярэднім 150 сажанцаў на адзін гэкт. мешанага саду, гэта дае магчымасьць засаджваць штогодна звыш 6.600 гэкт. саду. Да вайны на абшары 3-х б. беларускіх губ. Менскай, Магілёўскай і Віцебскай засаджвалася 800-900 гэкт. новага саду ў год.

Такім чынам, пасадка пладовых садоў у Беларусі, спыненая ў 1915-16 г. г. з прычыны вайны, зноў распачнецца толькі з бягучага году. Да гэтай працы прышлося рыхтаваць пашч год—з 1924 да 1928 г. уключна. Вынікам упартай 4-х гадовай працы зямельных органаў і спэцыялістых па садоўніцтву зьяўляецца 50 пладовых выхавальнікаў з прадукцыяй адзін мілён сажанцаў у год.

Цяпер перад мясцовымі зямельнымі органамі і спэцыялістамі па садоўніцтву стаіцца другая задача—арганізацыя групавога садоўніцтва.

Сучаснае сялянскае садоўніцтва, узьнікшае стыхійна, без усялякага агранамічнага кіраўніцтва, мае шэраг арганізацыйных недахопаў, якія перашкаджаюць разьвіцьцю яго таварнасьці. Рэмаўнія ліпкі затрымоўваюцца, галоўным чынам, з садоў севгасаў, калгасаў і іншых нацыяналізаваных гаспадарак. Сялянскае-ж садоўніцтва, ня гледзячы на значныя разьмеры па займаемай імі плошчы, мае спажыўны характар, за выключэньнем некалькіх райёнаў (Бабруйскі, Гомельскі, Магілёўскі), у якіх яно мае прамысловае значэньне. Прычынамі, затрымліваючымі разьвіцьцё таварнасьці сялянскага садоўніцтва, зьяўляюцца раскінутасьць садоў, вельмі малыя разьмеры плошчы іх, значная стракатасьць асартыманту, сярод якіх шмат ня найлепшай вартасьці, і інш. Вось галоўнейшыя арганізацыйныя недахопы, якія не павінны мець месца ў далейшым.

Каб зьнішчыць гэтыя арганізацыйныя недахопы сялянскага садоўніцтва, неабходна знайсьці для яго такія новыя арганізацыйныя формы набудовы пладовых насажденьняў, якія давалі-б магчымасьць згуртоўваць раскінутыя на вёсцы дробныя садзікі ў адным месцы, у выглядзе як-бы аднаго супольнага саду, з адзінымі асартыментам, аднаковымі пропантнымі суадносінамі дрэў па народах, парадкам разьмяшчэньня дрэў і інш. Такімі арганізацыйнымі формамі набудовы сялянскага садоўніцтва ў умовах разьвіцьця сацыялістычнай гаспадаркі прызнаюцца тыпы групавых садоў, пад якімі разумеецца пладовае насажденьне, выяўляючае сабой злучаньць некалькіх індывідуальных садоў на сумежных вучастках зямлі. Пасадка такіх садоў можа вытварацца як на насядзіных вучастках, так і па-за садзібамі, на вучастках зямлі, якія адводзяцца для гэтай мэты пры правядзеньні землянарадкаваньня з зямельных надзелаў. Наогул, арганізацыя групавога садоўніцтва мае мэтай узбуйненьне дробнага сялянскага садоўніцтва шляхам групаваньня садоў вёсні ў адным месцы, увядзеньня на ўсіх індывідуальных садох такое групы адзінага асартыменту і аграмаджаньне работ у садох.

Разьвіцьцю гэтай арганізацыйнай формы садоўніцтва вельмі спрыяе пасялковае землянарадкаваньне, вызначанае са значным пашырэньнем плошчаў сядзібных месц. Зараз мы маем шмат пасёлкаў, якія ўжо адбудаваліся і імкнуцца перайсьці на больш інтэнсыўныя формы гаспадараньня, заводзяць шматпалёвыя севазвароты і шукаюць пасадачнага матар'ялу для пасадкі садоў. Вось тут мясцовым зямельным органам і агранамічным працаўнікам, як садаводам, так і райённым аграномам, неабходна своечасова выкарыстаць імкненьне пасялкоўцаў да разьвіцьця садоўніцтва і разгарнуць самую шырокую працу па арганізацыі групавых садоў на ўзмоцненых ужо пасёлках, галоўным чынам, у райёнах чыгунак, рэчак, гарадоў і мястэчак.

Да пачатку дрэўпасадкі застаецца яшчэ месяца паўтара, час кароткі, але зрабіць яшчэ можна шмат. Неабходна мабілізаваць усе сілы, каб пачатак гэтай працы, зусім яшчэ новы, даў належныя вынікі.

Беларусь павінна стаць краінай садоўніцтва. Садоўніцтва, самая прыбытковая галіна сельскай гаспадаркі, павінна стаць заняткам кожнага селяніна. Да пасадкі групавых садоў неабходна прыцягнуць камсамольскія ячэйкі, вучняў, настаўніцтва і ўсё перадавое сялянства. Сяляне дасьледчыкі-садаводы павінны стаць першымі агітатарамі групавога садоўніцтва і дапамагаць мясцоваму агранамічнаму персаналу ў гэтай надзвычайна цікавай і карыснай працы.

Праца па арганізацыі групавога садоўніцтва павінна быць выканана і будзе выканана з посьпехам.

К. Хабэнка.

Дасьледваньне сельскай гаспадаркі.

Да гэтага часу Беларускі Дасьледчы Інстытут сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна арганізаваў 11 экспэдыцый па вывучэньні розных галін сельскай гаспадаркі. Былі абсьледаваны 22175 сялянскіх гаспадарак на розныя тэмы. З распрацаваных ужо матар'ялаў, а таксама яшчэ незакончаных, будуць складзены 1035 розных манаграфій.

Былі праведзены наступныя экспэдыцыі: па вывучэньні пасялковай формы землякарыстаньня, тэхніка-эканамічнага эфэкту землянарадкаваньня, па эканоміцы мэліярацыі, па эканоміцы ільнянай культуры, па эканоміцы с-г. Мазырскага Палесься, па вывучэньні рыначнае сьвінагадоўлі Случчыны, па эканамічнаму профілю БССР, па эфэктыўнасьці сельска-гаспадарчага крэдыту, па эфэктыўнасьці с-г. укладаньняў у сельскую гаспадарку і па вывучэньні севазвароту ў БССР.

Вось вынікі некаторых экспэдыцый.

Экспэдыцыя па вывучэньні пасялковай формы землякарыстаньня паказала, што пасёлкі, у параўнаньні з вёскамі, маюць шмат пераваг. Зьмяншаецца сярэдняя адлегласьць палёў з 1626 мэтр. да 708 мэтр., колькасьць палосак зьмяншаецца ў 2-3 разы і павялічваецца іх пляц ад 0,12 да 0,44. Праз 4 гады пасёлкі даюць такі гаспадарчы эфэкт: пляц землякарыстаньня павялічваецца на 24 пр.

Экспэдыцыя па вывучэньні тэхніка-эканамічнага эфэкту землянарадкаваньня выявіла, што землянарадкаваньне зьмяняе клясавыя суадносіны ў вёсцы і ўзмацняе гаспадарча групу беднякоў і сераднякоў і паслабляе групу заможных. Апроч гэтага, павялічваецца агульны пляц землякарыстаньня і процант больш інтэнсыўных ужыткаў. У галіне ільнаводзтва экспэдыцыя па вывучэньні эканомікі ільнянай культуры ўстанавіла факт глыбокага крызісу таварнай ільнянай гаспадаркі. Таварнасьць ільнянага валакна вельмі высокая—62,6 проц. Выхад-жа таварнае масы валакна надзвычайна малы —2,47 пуд. на адну гаспадарку. Ураджайнасьць лёну стаіць на ніжэйшай ступені—11,74 пуд. на гэктар.

Экспэдыцыя па вывучэньні эканомікі сельскае гаспадаркі Мазырскага Палесься выявіла факт павялічэньня таварнасьці мяснога жывёлаводзтва за апошнія 5 год і выпадзеньне мясцовага збожжа з гандлёвага звароту.

Вельмі цікавымі зьяўляюцца вынікі экспэдыцыі па вывучэньні эфэктыўнасьці сельска-гаспадарчага крэдыту. Выяўлена, што сялянская гаспадарка БССР вельмі мала насычана крэдытамі. Найбольшы недахоп крэдыту адчуваецца на корм жывёле, на штучнае ўгнаеньне, на палепшаньне насеньня збожжавых культур.

Экспартны плян выканаем.

За тры кварталы выканалі 84 проц. гадавога экспартнага пляну.—Сёлета загатоўчую кампанію распачнем падрыхтаванымі.

Водлуг даных Наркамгандлю БССР, за першыя тры кварталы бягучага году наш экспартны гадавы плян па другараднай сыравіне выканан на 84 проц.

Адначасова трэба адзначыць, што, побач з досыць добрым выкананьнем пляну па некаторых відах другараднай экспартнай сыравіны—слаба выкананы экспартны плян па конволасу, кішсыравіне, рызьбю, шклу і шкляных вырабах, а таксама па некаторых іншых дробных прадуктах.

Некаторыя загатоўчыя арганізацыі свае экспартныя пляны выканалі досыць добра. Так, Белсельтрэст выканаў за тры кварталы поўнасьцю свой гадавы плян.

Запалкавы трэст—на 97 проц., Лесбел—на 92 проц., Белдзяржгандаль—на 90 проц. і Паляўнічы саюз—на 100 проц.

Слаба выканалі свае экспартныя пляны Шклотрэст—усяго толькі 28 пр. гадавога пляну, Белшчаціна—62 проц., Белкаапсаюз—73 проц., і „Кустпромсаюз"—74 проц.

Зараз прыняты рашучыя захады да таго, каб адстаючыя загатоўчыя арганізацыі і, наогул, усе загатоўцы скарысталі канец сэзону бягучага году для ўзмацненьня загатовак сэзонных экспартных тавараў як брусьніцы, цыбулі, чарніцы і шэрагу іншых другарадных экспартных тавараў.

Побач з гэтым Наркамгандлю запрапанаваў сельска-гаспадарчай каапэрацыі і Белдзяржгандлю прыняць меры да поўнага ахопу загатоўкі прадуктаў пташніцтва.

У працы нашых загатоўчых арганізацый за гэты тэрмін было шмат недахопаў:—яны слаба разгарнулі загатоўку другараднай сыравіны; назіраўся ажыятаж на рынку і пераплата ўстаноўленых цэн. Да недахопаў можна таксама аднесьці і несваечасовы вываз тавараў, а таксама дрэнную сарціроўку і пакоўку экспартных тавараў.

У далейшай працы загатоўчыя арганізацыі павінны зьвярнуць увагу на зьнішчэньне гэтых недахопаў і асабліва на палепшаньне якасьці і стандарту тары.

Наркамгандлю прыняў усе меры да таго, каб поўнасьцю быў выкананы экспартны плян бягучага году, і ёсьць усе падставы меркаваць, што ён будзе выкананы.

У сучасны момант ідзе прапрацоўка і ўдакладненьне экспартнага пляну на 1928-29 г. Вядзецца таксама прапрацоўка паасобных заданьняў па загатоўцы экспартных тавараў па акругах і арганізацыях з такім разрахункам, каб на месцах былі своечасова атрыманы зацьверджаныя пляны і каб можна было своечасова распачаць загатоўчую кампанію. З некаторых округ ужо паступілі заключэньні па загатоўчых плянах. У большасьці выпадкаў месцы згодны з плянам НКГ і нават павялічваюць іх па асобных відах тавараў.

У заключэньне можна сказаць, што сёлета загатоўчую працу распачнем падрыхтаванымі, і трэба будзе толькі зьвярнуць увагу на непаўтарэньне памылак мінулага году.

ПЕРАД ЗАГАТОЎКАЙ ЛЁНУ.

Загатоўчы сэзон на валакно (лён, кудзелю, пяньку і інш.) скончыўся, але далёка не здавальняюча, бо плян ня выкананы на 100 проц. На глебе загатоўчай кампаніі было шмат непаразуменьняў: плян быў складзен нерэальны і нежыцьцёвы, эканамісты в Наркамгандлю не здавалі належнай увагі вывучэньню насеўнай плошчы, а лічбы часта даваліся нічым не абгрунтаваныя.

Досыць зазначыць, што Наркамгандлю БССР была дадзена дырэктыва загатоніць у чэрвені і ліпені больш валакна, як у папярэднія месяцы, у той час як чэрвень і ліпень максымум могуць даць 10 проц. таго, што даюць сакавік, красавік і май.

Пытаньне аб дастаўцы ільнаводным райёнам прамтавараў і хлеба паставлена са спазьненьнем; апроч таго, каапэрацыйныя арганізацыі ў гэтай справе выяўлялі вялікія капрызы, не заўсёды здавальнялі сялян, і калі, напрыклад, апошнія дастаўлялі квітанцыі аб здачы імі валакна Белдзяржгандлю, дык часамі некаторыя каапэрацыйныя прапаўнікі не хацелі даць прамтавараў, муки і г. д.

На ўсе гэтыя ненармальныя зьявішчы «Савецкая Беларусь» у свой час рэагавала, і меры былі ўжыты, але вельмі позна.

Неабходна яшчэ адзначыць, што загатоўка лёну вялася ня тым тэмпам, як патрэбавалася.

Вось у кароткіх рысах тыя прычыны, якія перашкаджалі загатоўцам поўнасьцю выканаць плян. Невыкананьне пляну давала шмат страты нашым фабрыкам і заводам як на БССР, так і РОФСР, бо апошнія складалі свае пляны на падставе пляну, зацьверджанага Наркамгандлю БССР.

Зараз мы ўступаем у новы сэзон загатоўкі лёну.

Мы лічым вусім лішнім зазначаць на ўсю важнасьць і сур'ёзнасьць гэтае загатоўкі як для патрэб мясцовай прамысловасьці, так і для экспарту. Гэта вусім ясна, і пра гэта гаварыць ня будзем, але трэба адначасна падкрэсьліць вельмі рашучае недабудзасьць зьнішчэньня поўнасьцю ранейшых памылак, неабходнасьць на месцах даць асобныя дырэктывы аб садзейнічаньні ўсім загатоўцам у правядзеньні гэтай кампаніі.

Трэба сказаць, што вышэйшыя дырэктыўныя органы (Наркамгандлю СССР) на новую кампанію павысіў цэны на лён на 25-26 проц. Неабходна, каб гэта дырэктыва бездакладна была накіравана ў самыя глухія куткі ільнаводных райёнаў.

Разам з гэтым трэба зазначыць, што ў мінулай кампаніі назіраліся нездаровыя і ненармальныя зьявішчы ў адносіне канкуренцыі: канкурыравала ня толькі каапэрацыя з іншымі органамі, але ўнутры каапэрацыі, унутры Белдзяржгандлю адзін пункт канкураваў з другім, жадаючы нахваліцца найбольшай загатоўкай. Вельмі сьмешная бегаціна за валакном стварыла такое становішча, пры якім справіна часта аказвалася недобраякаснай, а таму пытаньне аб якасьці тавару павінна быць пастаўлена на першым месцы.

Зразумела, тут немагчыма пералічыць тыя ўсе дефекты, якія былі ў мінулай кампаніі, але з адкрытым сумленьнем трэба сьцьвердзіць, што іх было вельмі многа, а таму зараз, напярэдадні новай кампаніі, неабходна ўзяцца за гэту справу сур'ёзна і ўхмілна.

Л. Манін.

А. Сянкевіч.

ВЁСКА, ЯК Я ЯЕ БАЧЫЎ*).

У канцы м. Бабра, крыху воддаль знаходзіцца яўрэйская зямлярабочая арцель. Аб'яднае яна каля 8 гаспадарак. Апрацоўка зямлі і прадуктаў—калектыўная. Кожная сям'я вылучае дзьве рабочыя адзінкі. Пасьля збору ўраджаю дзеляць усю прадукцыю пароўныя часткі паміж сем'ямі, ня гледзячы на лік едакоў сям'і. Пастанова цэнтру, каб 10 проц. адлічаць на дзацей, дагэтуль ня выконвалася. Жанчыны чамусьці не працуюць на полі, і ўлетку арцель наймае дадатковую сілу. Арцель мае за 3 вярсты ў вёсцы Шыпка сад, які даглядаюць ня члены калектыву, а па дагавору два гаспадары з в. Шыпкі.

Арцель пасадзілі на лядах. Няпрызвычаенаму да зямляробчай працы яўрэйскаму жыхару прышлося пакласьці шмат сілы і грошай на выкарчаваньне. Хтось кадумаў надзяліць арцель яшчэ трактарам, якога абсалютна ня было дзе ўжыць, і яго ніадуўна прадалі ў другі райён. Такія ўмовы прымусілі арцель браць крэдыт і пазыкі. За арцельную вялікая завінавачанасьць. Ня гледзячы на цяжкія ўмовы працы, члены арцелі ня падаюць духам і памаленьку становяцца на ногі.

Іду ў вёску Худаўцы. Там павінны быць садова-гародняя і сьвінаводная арцелі і машыннае таварыства. Заходжу да настаўніка. Застаў яго на дварэ. Настаўнік сам ладзіў воз. Працуе ўжо гадоў 19 у гэтай школе. Арандуе школьны вучастак зямлі, які падзяліў на шасьцідольле. На дварэ бегае ладнае парасё ангельскага гатунку. Настаўнік зьяўляецца членам сьвінаводнай арцелі.

Распытваю. Арцель аб'яднае восем сялян; у іх адзін сын папа, адзін хутаранін. Сыну папа даручылі карміць сьвіней. Для гэтай мэты давалася пэўная порцыя збожжа. У выніку папоўскага кармленьня сьвіньні ня толькі ня прыбывалі ў вазе, а яшчэ страцілі за летнія месяцы каля 2-х пудоў. Кажуць, што папавіч пойдзе пад суд.

Першы выпадак—сьвіней падзялілі паміж членамі

Маскоўская опэра.

«КАРМЭН». Муз. Бізэ. 18-га жніўня 1928 г.

У чым ляжыць прычына папулярнасьці опэры «Кармэн» на сцэнах усяго сьвету? Яна была напісана яшчэ ў 1875 годзе, а праз 5 год пасьля яе выяўленьня аб ёй лісаў Чайкоўскі: «Гэта ў поўным сэнсе шэдэўр, г. ё. адна з тых нямногіх рэчаў, якія ў найвялікшым стопні адбіваюць у сабе музычныя імкненьні цэлае эпохі. Гэта чароўна, прыгожа спачатку да канца. Піканткных гармоній, вусім новых гукавых камбінацый—мноства, але ўсё гэта ня ёсьць выключная мэта. Бізэ—мастак, які аддае дань веку і сучаснасьці, але сагрэты шчырым натхненьнем" (ліст да Н. Ф. Мекк—18 ліпеня 1880 г.).

Чайкоўскі, як вялікі музыка, высунуў наперад адзін бок—бок чыста музычны, але ёсьць і іншыя бакі ў творы Бізэ, якія дагэтуль вабяць слухача. Гэтыя бакі—мастацкі і ў той-жа час праўдзіва жыцьцёвы рэалізм опэры і той чароўны гішпанскі couleur local (мясцовая, нацыянальная афарбоўка), якім прасякнута ўся опэра.

З гэтых трох бакоў і трэба падыйсьці да ацэнкі спэктаклю 18-га жніўня.

З боку couleur local ніякіх папрокаў нельга зрабіць пастаноўшчыку: зроблена было ўсё, што магчыма ў умовах працы прыезджага, ня сталага калектыву.

З боку музычнага аб дырыжэры Клібсоне можна гаварыць у слоках толькі пахвалы. Звычайная пад яго кіраўніцтвам прыгожасьць ігры аркестру была і цяпер. Часам хапелася аркестр слухаць болей, альбо прынамсі ня меней, чымся сьпевакоў. Увэрцюра, якая часта, асабліва на правінцыяльных сцэнах, гучыць груба і вульгарна, у яго прагучала лёгка і прыгожа. Меней лёгка і, сказаў бы я, ня досыць паэтычна, удаўся таленавітаму дырыжэру вядомы ўступ да 4-ай дзеі. У асобе Клібсона калектыў мае бязумоўна надзвычайна таленавітага працаўніка-мастака.

З боку жыцьцёвасьці перадачы задум кампазытара справа была ня вусім гладкая.

Паставім такое пытаньне: хто такая Кармэн? Ці ёсьць гэта простая распусьніца, простая, грубая, вульгарная фабрычная работніца—дзеўка (з пункту погляду францускага буржуа), або нешта глыбейшае? Калі ўважліва ўчытацца ў лібрэтта опэры і ўслухацца ў музыку, якою ілюстравана гэтае лібрэтта, дык мы ўбачым, што Кармэн ня ёсьць грубая, вульгарная распусьніца, але жрыца каханьня, якая дзеля каханьня, можа быць мімалётнага, але шчырага і агнёвага, не баіцца ніякіх пагроз, сьвядома ідзе на сьмерць і ў канцы канцоў і гіне сапраўды за сваё каханьне. У ёй шмат поэтычнасьці і нават нейкай велічы.

Артыстка Хорына, якая іграла ролю Кармэн і ў якой трэба прызнаць буйны сцэнічны талент, зхучыла ў сваім выкананьні абодвы гэтыя разуменьні асабістасьці Кармэн. Адсюль выйшла тое, што Кармэн першых дзьвюх дзей не адпавядала Кармэн дзьвюх апошніх дзей. У першых дзьвюх дзеях таленавітая артыстка, як кажуць, «перагрывала», і часта зьнікала ўся грацыёзнасьць і паэтычнасьць жрыцы каханьня, а на паверхню выпірала адна вульгарнасьць і распуства. Ніякім чынам нельга згадзіцца з такім тлумачэньнем ролі Кармэн. Затое сапраўдную Кармэн, з яе поэтычнасьцю, палкасьцю, адданасьцю, і веліччу была Хорына ў 2-х апошніх дзеях. Зразумела, таленавітасьць артысткі бліснула на працягу ўсяго спэктаклю, але паказаная супярэчнасьць у трактоўцы ролі Кармэн была бязумоўным недахопам.

Сьпявак-мастак Брыгіневіч правёў сваю ролю Хозэ са сваім звычайным майстэрствам і натхнёнасьцю. Ненараўнана поэтычна прагучала яго арыя (в краскай) у другой дзеі.

Прыемнае ўражаньне зрабіў Эскамілва—Паўлоўскі, які з немалой дынамічнасьцю прапяяў вядомыя куплеты торэадора.

Добра сьпявала і артыстка Бэнгар, але... але роля Мікаэлі—не яе роля. Гэта было добрае сапрано, але ня Мікаэля.

Не магу не адзначыць надзвычайна прыгожае выкананьне жаночага дуэту ў сцэне гаданьня на картах (Фраскіта—Пятрова і Мэрсэдэс—Троіцкая) у 3-яй дзеі.

Балет у 2-ай дзеі праведзены быў з вялікаю дынамічнасьцю і меў заслужаны посьпех у публікі.

Арыон.

Касьцяная справа.

Дзяржаўнаму Трэсту Тэжэ для выробаў клею патрабуецца косьць, а рабіць загатоўку на Беларусі ніхто ня браўся—узяўся Белдзяржгандаль.

Заходняя кантора Тэжэ ня трацячы часу заключыла зьдзелку з Белдзяржгандлем на вельмі добрых умовах для Белдзяржгандлю і апошні пры наліччы сваіх спэцаў з косьці мог бы мець добрыя прыбыткі.

Белдзяржгандаль зараз-жа абежнымі лістамі загадаў сваім агенцтвам, каб апошнія тэрмінова прынялі рашучыя крокі на загатоўку косьці і адгрузку на чыгуначную станцыю Масква.

Агенцтвы загад выконваюць—косьць загатаўляюць і грузяць у вагоны і такім чынам Гомельскім, Віцебскім, Шклоўскім і інш. агенцтвамі адгружана 9 вагонаў косьці для Тэжэ на суму каля 5000 руб.

Калі Тэжэ пачало прымаць косьці, дык аказалася да 30 проц. браку і замест косьці сталовай—косьць палявая. З гэтага відаць, што вельмі добрыя спэцы загатаўлялі, што не маглі адрозьніць палявой косьці ад сталовай.

Тэжэ аб гэтым напісала адпаведны ліст Белдзяржгандлю і разам прыслала перарахунак па рахунку Белдзяржгандлю на суму 1389 руб. 91 кап., якія грошы і былі недаплачаны заходняй канторай Тэжэ.

Цікава адзначыць, колькі спэцы Белдзяржгандлю налічылі прыбыткаў па загатоўцы косьці для Тэжэ. К. Д.

БССР НА ЎСЕСАЮЗНАЙ СПАРТАКІЯДЗЕ.

ФУТБОЛЬНАЯ КАМАНДА БВА ВЫШЛА Ў ФІНАЛ.

Пабіўшы каманду АДПУ з вынікам 2:1, каманда Бел. Вайск. Акругі вышла ў фінал разам з камандай флёту. Гэты матч вызначыў агульнае першынства.

ПАДРАБЯЗНАСЬЦІ ПЕРАМОГІ БЕЛАРУСКАЙ ФУТБОЛЬНАЙ КАМАНДЫ.

Фізкультурныя аддзелы ўсіх маскоўскіх газэт прысьвячаюць матчу Беларусь—Швэйцарыя шмат радкоў, называючы перамогу Беларускай каманды «сюрпрызам» на футбольным матчы.

«Гудок» прыводзіць падрабязнае апісаньне ўсёй гульні, у канцы дадаючы: «Для большасьці публікі перамога Беларусі зьявілася поўнай нечаканасьцю.

Каманда Швэйцарыі паказала вельмі добрую гульню ў першым спатканьні з аўтаномнымі рэспублікамі ў першынствах РСФСР і дайшла да паўфіналу. У моцнай каманды аўтаномных рэспублік швэйцарцы выйгралі з вынікам 7:1.

Трэба аддаць справядлівасьць Беларускай камандзе, паказаўшай у гэты дзень прыгожую гульню».

«Пераможцы паказалі вялікую хуткасьць і націск у гульні. Іх гальпінер Халмаураў будзе карыстацца на футбольных палёх вялікай папулярнасьцю».

На гэтым матчы прысутнічала звыш сарака тысяч гледачоў.

ФУТБОЛЬНАЕ СПАТКАНЬНЕ БЕЛАРУСЬ—УКРАІНА.

Чарговым спатканьнем беларускай футбольнай каманды будзе з Украінай. Украіская каманда вельмі моцная і прэтэндуе на агульнае першынства СССР. Такім чынам, гэта спатканьне будзе вельмі добрай лекцыяй для маладой Беларускай каманды.

ВАЙСКОВЫЯ СТРАЛКОВЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ.

Каманда Беларускай Вайсковай Акругі заняла на вайсковых стралковых спаборніцтвах пятае месца. Грамадзянскай камандзе, як вядома, больш пашчасьлівілася (другое месца).

Культурныя навіны.

ДРАМА ГАРОНІМА МАРЦІНКЕВІЧА.

У маёнтку Селігоры, Лепельскага р., у дарэвалюцыйным часы знаходзілася вялікая бібліятэка, у якой было шмат рэчаў з беларускай культуры. Паміж іншым, тут знаходзілася драма „Аказія падпалкоўніцам" Гароніма Марцінкевіча (брат Вінцука Марцінкевіча), якая ў 1862 г. ставілася на Віцебскай сцэне.

Лепельскае краязнаўчае т-ва зараз вядзе адшуканьне гэтага твору.

ВЫВУЧЭНЬНЕ ТВОРАЎ КАГАНЦА.

Тав. Касьпяровіч напісаў кнігу аб творчасьці беларускага пісьменьніка Каганца. Каб атрымаць больш падрабязны матар'ял аб пісьменьніку, т. Касьпяровіч зьбірае матар'ялы, запісаньні аб Каганцу яго прыяцелем Багданам і інш.

Апроч гэтага, Койданаўскае краязнаўчае т-ва зьбірае ўспаміны сялян аб Каганцу, які жыў у мястэчку доўгі час.

УКРАІНА ЦІКАВІЦЦА КРАЯЗНАЎСТВАМ БССР.

Ва украінскім часопісу „Чырвоны Шлях" зьмешчаны вялікі артыкул аб беларускім краязнаўстве. Украінскія культурнікі вельмі цікавяцца формай і мэтодыкай нашага краязнаўчага руху, якое найбольш падыходзіць да ўмоў Украіны.

СТАРОНКА З ЖЫЦЬЦЯ БЕЛАРУСІ.

ЦБ краязнаўства зьвярнулася да старага беларускага дзеяча з нашаніўскай эпохі, Лявона Гвозда, які зараз знаходзіцца ва Уладывастоку, напісаць свае ўспаміны аб сваёй дзейнасьці і аб усіх тых беларускіх культурніках, з якімі яму прыходзілася сустракацца.

ВЫВУЧЭНЬНЕ ДУБРОВЕНСКАГА РАЙЁНУ.

26-га жніўня ў Дубровенскі райён выяжджае экспэдыцыя ў складзе Сэрбава, Касьпяровіча, Жураўскага і Васілеўскага. Экспэдыцыя ставіць мэту вывучыць жыцьцё і ўсе рэчы, а таксама вопратку, гаспадарку, гісторыю, археалёгію і пачаткі новага быту райёну.

Агульнае геаграфічнае апісаньне райёну ўжо складзена праф. Лунгерсгаузэнам.

ХРОНІКА.

ХАРЧАВАНЬНЕ ДЛЯ ДЭМАБІЛІЗАВАНЫХ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ.

Гэтымі днямі пры Наркамгандлі БССР адбылася міжведамсьцьвенная нарада з удзелам прадстаўніка ваенведу, якая абмяркоўвала пытаньне арганізацыі харчовай дапамогі дэмабілізаваным чырвоннармейцам.

Нарада пастанавіла даручыць акруговым інспэктарам гандлю супольна з транспартнай і спажывецкай каапэрацыяй арганізаваць пры чыгуначных станцыях: Гомель, Віцебск, Ворша, Жлобін, Асіпавічы і Бабруйск сталоўкі з гарачымі абедамі, з такім разрахункам, каб кожны абед з 2-х страў каштаваў не даражэй 20-ці кап.

Апроч гэтага, пры буйных і вузлавых чыгуначных станцыях павінны быць арганізаваны ларкі дзеля забесьпячэньня дэмабілізаваных чырвоннармейцаў прадметамі першай патрэбы, па самых танных цэнах.

У Народным Камісарыяце РСІ.

Аб рацыяналізатарскай працы ў установах.

Калегія НК РСІ, разглядзеўшы пытаньне аб арганізацыі кіраўніцтва рацыяналізатарскай працай ва ўстановах, даручыла т. Ракаву распрацаваць канкрэтныя мерапрыёмствы аб утварэньні арг. бюро (па рацыяналізацыі).

Зацяжка ў прадстаўленьні 5-гадовых плянаў.

З боку накаторых устаноў дапушчана зацяжка і няўвязка ў складаньні 5-гадовага пляну народнай гаспадаркі і культуры, асабліва з боку НК Асьветы, Галоўнавукі і Наркамзему. Калегія НК РСІ запрапанавала прыняць тэрміновыя меры да складаньня 5-гадовага пляну.

Ненармальнасьці ў будаўніцтве сыр'явога складу.

Калегія НК РСІ адзначыла цэлы шэраг ненармальнасьцяў у будаўніцтве сыр'явога складу Скурсындыкату ў Менску.

Гаспадаром будаўніцтва зьяўляецца Скурсындыкат, які гэта будаўніцтва перадаў скуртрэсту, а скуртрэст у сваю чаргу перадаў будаўніцтва Белдзяржстрою. Такім чынам, невядома, хто гаспадар і хто нясе адказнасьць за будаўніцтва складу.

Калегія НК РСІ запрапанавала скончыць будаўніцтва ў бягучым сезоне.

У Прэзыдыуме Менскага гарсавету.

Грамадзкія работы разгарнуліся.

Прэзыдыум гарсавету сьцьвердзіў, што грамадзкія работы сёлета распачаліся з вялікім спазьненьнем і толькі ў апошні час яны належна разгарнуліся.

Каб скарыстаць поўчасьцю асыгнаваныя сродкі, запрапанована лік рабочых, занятых на грамадзкіх работах, давесьці да 1000 чал. Запрапанована таксама павялічыць лік жанчын на грамадзкіх работах. Дадзены таксама ўказаньні для зьнішчэньня ўсіх недахопаў у галіне санітарнага і культурнага абслугоўваньня рабочых грамадзкіх работ.

«Водоканал» ня выконвае дагавору.

Гарсавет запрапанаваў Эльводу прадявіць іск „Водоканалу" за пратэрміноўку выкананьня дагавору на бурэньні брукліскіх калодзежаў.

У выпадку няпрыняцьця «Водоканалам» мер да выкананьня дагавору гарсавет даў дырэктыву Эльводу перадаць бурэньне другой арганізацыі.

Прызначэньне кіраўніка будаўніцтвам трамваю.

Прэзыдыум гарсавету сьцьвердзіў прызначэньне кіраўніком будаўніцтва Менскага трамваю інжынэра Кадушына.

20.000 руб. Жакту «Іскра».

Прэзыдыум гарсавету пастаравіў уключыць у плян крэдытаваньня 20.000 руб. для Жакту „Іскра" на сканчэньне пачатых будаўнічых работ.

Пра адкліканьне выбаршчыкамі з саветаў выбраных імі дэпутатаў.

Прэзыдыум ЦВК сьцьвердзіў пастанову пра зьмену арт. 1 уводнай часткі пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР «пра адкліканьне выбаршчыкамі з саветаў выбраных імі дэпутатаў». Згодна гэтай пастановы выбаршчыкі могуць адклікаць з саветаў выбраных імі дэпутатаў за: невыкананьне наказаў выбаршчыкаў, адмаўленьне ад выкананьня даручэньняў саветаў, сыстэматычнае ненаведваньне пасяджэньняў саветаў, недапушчальнае для члена савету трыманьне і па іншых розных прычынах.

Аб водпуску члену прэзыдыуму ЦВК БССР тав. Сташэўскаму.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў прадаставіць Члену Прэзыдыуму ЦВК БССР тав. А. Сташэўскаму месячны водпуск з 10-га жніўня г. г.

Каміся па правядзеньні 7-мігадзіннага рабочага дню.

Саюзны Савнарком здаволіў хадайніцтва аб арганізацыі пры Савнаркоме БССР камісіі для папярэдняй прапрацоўкі пытаньняў, зьвязаных з правядзеньнем 7-мігадзіннага рабочага дню ў прамысловасьці рэспубліканскага і мясцовага значэньня.

Суботнікі на карысьць камсамолу Польшчы і Заходняй Беларусі.

У сувязі з надыходзячым сьвяткаваньнем 14-га Міжнароднага Юнацкага Дню, ЦК ЛКСМБ пастанавіў правесьці па БССР шэраг масавых суботнікаў. Усе сродкі паступіўшыя ад гэтых суботнікаў, пойдуць на карысьць камсамолу Польшчы і Заходняй Беларусі. Суботнікі будуць праводзіцца рабоча-сялянскай моладзьдзю.

Статуя Францішка Скарыны.

Беларускі дзяржаўны музэй заказаў студэнту Ленінградзкай Акадэміі мастацтв тав. Азгуру зрабіць у натуральны рост статую Францішка Скарыны. Таварыш Азгур ужо прыступіў да выкананьня гэтай працы.

10-цігодзьдзе існаваньня беларускага тэатру.

У сьнежні месяцы спаўняецца 10-цігодзьдзе існаваньня беларускага тэатру. У сувязі з гэтым, Галоўмастацтва пры Наркам. Асьветы БССР пачало рыхтаваньне да гэтага юбілею: падшукваюцца матар'ялы і вядзецца арганізацыйная праца. Адначасова з гэтым Галоўмастацтва пачало рыхтаваньне да адзначэньня юбілею 10-цігодзьдзя агаласьленьня БССР і 100-годзьдзя з дню нараджэньня Льва Талстога.

Выпуск Беларускай Аб'яднанай Вайсковай Школы.

У пачатку верасьня адбудзецца чарговы выпуск курсантаў Беларускай Аб'яднанай Вайсковай Школы імя ЦВК БССР. Выпуск курсантаў адбудзецца пры ўрачыстых абставінах.

26.100.000 руб. на крэдытаваньне сельскай гасп.

Плян сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту БССР у наступным годзе прадугледжвае крэдытаваньне сельскай гаспадаркі па ўсіх сродках у суме 26.100.000 руб., што дае павялічэньне супроць бягучага году на 7.100 тысяч рублёў.

Дагавор Белдзяржкіно з нямецкай кінофірмай.

Управа Дзяржгандлю БССР, на даручэньні Белдзяржкіно, заключыла дагавор з адной буйнай нямецкай кінофірмай «Гольм» на загатоўку сумесна з Белдзяржкіно двух кінофільм.

Загатоўка гэтых кіно-фільм абыйдзецца ў 500.000 залатых марак.

Экспарт беларускіх кіно-фільм за межы.

Управа Дзяржгандлю БССР прыступіла да экспарту беларускіх—кіно-фільм за межы. Ужо экспартаваны ў Літву, Данцыг, Польшчу і Нямеччыну кіно-фільм: «У вялікім горадзе» і „Прастытутка". Вядуцца перагаворы аб экспарце беларускіх кіно-фільм з іншымі дзяржавамі, у тым ліку з Паўдневай Амэрыкай. Наогул, трэба адзначыць, што замежнымі маёнца вялікая зацікаўленнасьць да беларускіх кіно-фільм.

Дапамога Дукорскім пагарэльцам.

Праўленьне Белсельбанку адпусьціла 10000 руб. крэдыту для аказаньня дапамогі пагарэльцам мястэчка Дукоры. Гэтыя сродкі будуць выдадзены пагарэльцам бедняце ў выглядзе доўгатэрміновага крэдыту.

Менскі дзень.

550 кілёграм азімай гатуновай пшаніцы атрымана ад Сэлекцыйнай станцыі Цімірэзеўскай с.-г. Акадэміі для дасьледчых станцый БССР.

У сувязі з правядзеньнем месячніка па барацьбе з бяспрытульнасьцю павышаны цэны на білеты ў кіно ад 2 да 5 кап.

У наступным годзе на фінансаваньне малочнай каапэрацыі мяркуецца адпусьціць 225000 руб., з іх 150000 руб. банкаўскага крэдыту, а рэшта—з бюджэтных сродкаў.

25000 руб. адпусьціў Белсельбанк Магілеўскаму камунальнаму трэсту на пабудову млына.

Лекавай сыравіны ў 1928-29 годзе мяркуецца загатовіць на 350000 руб. Загатоўку будуць весьці сельска-гаспадарчая каапэрацыя і іншыя загатоўчыя арганізацыі.

Барацьба з бяспрытульнасьцю.

Скарбоначны збор у Менску.

18 і 19 у Менску быў арганізаван скарбоначны збор у карысьць бяспрытульных. Скарбоначны збор будзе праводзіцца кожную нядзелю ў працягу месячніка.

Лётарэя дала добрыя грашовыя вынікі.

За першыя чатыры дні лётарэя Менскага акруговага н-ту на барацьбе з бяспрытульнасьцю дала збору каля 600 руб. За гэты час была разыграна значная колькасьць каштоўных рэчаў.

Вечар на карысьць бяспртульных.

У садзе саюзу харчавікоў у нядзелю, 19-га жніўня, быў арганізован вечар, увесь чысты збор якога пойдзе на карысьць бяспрытульных. Такія вечары будуць арганізоўвацца і іншым саюзы.

Барысаў не адстае.

У г. Барысаве даволі актыўна разгарнулася кампанія месячніка па барацьбе з бяспрытульнасьцю. Вакол гэтага пытаньня ўзнята грамадзкая думка насельніцтва.

Кантрактацыя пасеваў.

Нар. Кам. Гандлю БССР накіраваў на зацьверджаньне ў Дзяржплян БССР пляны кантрактацыі пасеваў на 1928-29 год.

Усяго будзе закантрактавана плошча ў 116.000 гэктараў, з іх: жыта—на 25.000 гэктараў, бульбы—на 15.000 гэктараў, канопілі—1000 гэктараў, лёну валакна—на 35.000 гэктараў, ячменю—5000 гэктараў і лёну-семя—35.000 гэктараў.

Гатунковая жывёла з-за межаў.

Белсельтрэст атрымаў з-за межаў 35 штук буйнай рагатай скаціны чырвонага гатунку, значную партыю гатункових сьвіней, гусей і курэй. Жывёла будзе зьмешчана ў племянныя гаспадаркі Белсельтрэсту.

Крэдыты на машынабесьпячэньне.

На забесьпячэньне сельска-гаспадарчымі машынамі і прыладамі сяланства да асенняй пасяўной кампаніі адпушчана 500000 руб. крэдыту. З гэтай сумы адпушчана Віцебскай і Бабруйскай акр.—70000 руб., Гомельскай—75000 руб., Менскай—115000 р., Магілеўскай—60000 руб. а рэшта—іншым округам.

Сэзон на торфараспрацоўках скончыўся.

Закончыўся сэзон на торфараспрацоўках Белторфу. Усяго за гэты сэзон выпрацавана: на тарфяным заводзе „Белае" (каля Барысаву)—4.500.000 штук і на тарфяным заводзе «Дымоўшчына»—8.500.000 штук. Зараз праводзіцца сушка торфу.

На тарфяных распрацоўках «Кісялевічы» (каля Бабруйску) заканчваецца пабудова рабочага пасёлку, а таксама сушка балот. У будучым годзе на торфараспрацоўках „Кісялевічы" будуць пастаўлены 3 машыны для здабываньня торфу.

Адкорм гусей.

Белсельсаюз і Управа Дзяржаўнага Гандлю сёлета праводзяць плянавую закупку гусей, якія будуць адкармлівацца на спэцыяльных адкормачных пунктах. Белсельсаюз мае намер закупіць каля 200 тысяч гусей. У Менскай акрузе Белсельсаюз мяркуе адкарміць да 60 тысяч, а Управа Дзяржаўнага Гандлю да 10 тысяч штук гусей.

Замежныя машыны для запалкавых фабрык.

Беларускі запалкавы трэст праз управу Дзяржгандлю БССР атрымаў з Нямеччыны вялікую партыю машын (аўтаматы для запалак, тачыльныя станкі і г. д.). Гэтыя машыны будуць устаноўлены на запалкавых фабрыках «Дняпро» ў Рэчыцы і «Чырвоная Барэзіна» ў Нова-Барысаве.

Мэханізацыя швэйнай прамысловасьці.

Швэйны трэст праз управу Дзяржгандлю БССР атрымаў з Амэрыкі партыю швэйных машын.

Машыны пойдуць для мэханізацыі Віцебскай і Менскай швэйных фабрык.

НАМ ПІШУЦЬ.

Палепшыце юрыдычную дапамогу.

Пры Халапеніцкім пардоме (Менскай акругі) існуе юрыдычная кансультацыя, усю працу па якой праводзіць правазабаронца гр. Жораў. Але з прычыны таго, што ня кожны дзень па кансультацыі бываюць дзяжурствы, юрыдычная дапамога насельніцтва не задавальне. Сяляне часта зьвяртаюцца да падпольных адвакатаў, якіх мяецца даволі шмат у р-не і плацяць па некалькі рублёў за напісаньне якой-небудзь заявы альбо касацыі ў той час, як у кансультацыі гэта магчыма было-б напісаць даромна.

У дадзейшым патрэбна правазабаронцу палепшыць працу па кансультацыі праз назначэньне дзяжурства на кожны дзень. На лішнім была-б і арганізацыя юрыдычнага гуртка пры пардоме для вывучэньня справы кансультацыі і дапамогі насельніцтву.

Ліўшыц.

Пабольш-бы такіх гурткоў.

У м-ку Казіміраў, Жлобінскага р-ну (Бабруйск. акр.) пастаўлікам Казіміраўскай школы з арганізован харавы гурток. Моладзь мястэчка вельмі зацікавілася гэтымі справамі. На сьпевы зьяўляецца шмат слухачоў. Гурток за кароткі час развучыў шмат беларускіх сьпеваў і з кожным днём усё больш цягнае ў свае шэрагі вясковую моладзь, асабліва дзяўчат.

У час перапынкаў паміж сьпевамі пастаўлікам праводзяцца гутаркі на розныя тэмы сучаснага становішча: калектывізацыі гаспадаркі і інш., якія пашыраюцца сярод насельніцтва. Гурток мае вялікае культасьветнае значэньне для вёскі.

Чаму няма громаадводу?

У г. Пятрыкове (Мазырчына) на радка бываюць абвугы, каб грамадзяне запасаліся газай, бо з прычыны рамонту станцыі электрычнага сьвету ня будзе. У сваю чаргу прычыняю шматлікіх рамонтаў зьяўляецца адсутнасьць громаадводу на станцыі, без якога пасьля кожнай навальніцы прыходзіцца заставацца без сьвету. Гэта становішча стараюцца скарыстаць папоўскія прыслужнікі ў мэтах эксплёатацыі вясковай цемры. Яны распаўсюджваюць такія весткі, што: „Калі бог пасылае ў час навальніцы на народ цемру, дык чортава сьвятло навіна патухнуць і яно тухнее.

Цікава ведаць, як думае наконт гэтага, а таксама наконт і лішніх гаспадарчых выдаткаў на рамонты наш заградчык камбінату, якія-б можна было скараніць праз пабудову громаадводу.

Трубка.

Ня скраў, а самаўласна забраў.

Селькорка В. Э. у заметцы запрашала Глускую раймілімцыю, што зроблена ёю па справе пакражы стогу сена ў гр-кі Сушко Ганны Якаў Федарцом.

Глускі РВК (Бабруйскай акругі) паведамляе, што па заметцы было вытваране дазнаньне, якім высьветлена, што гр-н Федарцоў Янка належнае гр-ны Сушко сена ня скраў, а самаўласна забраў як спрачэне. Справа дазнаньня накіравана 31-XII—27 г. ў Нарсуд 4 уч. Бабруйскай акругі для прыцягненьня Федарца да адказнасьці.

Зарубежныя вайсковыя навіны.

ВАЙСКОВАЯ ПАДРЫХТОЎКА ЖАНЧЫН У ФІНЛЯНДЫІ.

30-га ліпеня ў Фінляндыі адчыніліся курсы Лотта-Сэрд (жаночая арганізацыя, якая ставіць сваёй мэтай абслугоўваньне армії ў часе вайны).

На курсах ёсьць аддзяленьні дзеля падрыхтоўкі кухарак, перапінчыц і санітарак. На курсы зьехалася 100 жанчын. Пасьля сканчэньня заняткаў на гэтых курсах будуць наладжаны месячныя курсы лекавай дапамогі.

ПЫТАНЬНЕ АБ БЕЗАПАСНАСЬЦІ ПЛАВАНЬНЯ ПАДВОДНЫХ ЛОДАК.

17-га сьнежня леташняга году амэрыканская падводная лодка „Л4" стукнулася з тарпэданосцам «Паўлдзінг» і патанула разам са ўсім экіпажам. У вывязку з гэтым падводнае плаваньне прыцягнула да сябе ўвагу ня толькі Злучаных Штатаў, але і іншых дзяржаў. Да гэтага часу марскі дэпартамант Злучаных Штатаў атрымаў каля 4000 прапаноў і праектаў па пытаньню аб палепшаньні бязапаснасьці плаваньня пад вадой.

НЕЛЬГА ЖАНІЦЦА З ЧУЖАЗЕМКАМІ.

У турэцкім парляманце праведзен закон, па якім афіцэрам і вайсковым чыноўнікам забаронена жаніцца з чужаземцамі. Усе тыя, што жэняцца з чужаземкамі пасьля выданьня гэтага закону, падлягаюць звальненьню з арміі бяз усялякага права на пэнсію. Тыя, што ажаніліся на чужаземках да прыняцьця гэтага закону, павінны выйсьці ў адстаўку. Яны маюць права на пэнсію адзведна тэрміну іхняй службы.

100 САМАЛЁТАЎ НА АВІАНОСЦЫ.

Найноўшы амэрыканскі авіаносец «Лексінгтон», які можа несьці каля 100 самалётаў, зрабіў пераход з Сан-Педро (Паўночная Амэрыка) у Ганалулу (Гавайскія выспы).

Гэты пераход роўен 2228 марскім мілям. Авіаносец ішоў з сярэдняй хуткасьцю каля 60 кілёмэтраў у гадзіну.

ЛЯГЕРНЫЯ ЗБОРЫ ВУЧНЯЎ У АНГЛІІ.

Як паведамляе ангельская газэта «Таймс», з 31-га ліпеня да 8-га жніўня ў Англіі адбыліся лягерныя зборы 15000 хлапчукоў-вучняў. Усіх хлапчукоў зьявілі ў 159 атрадаў малодшага аддзяленьня корпусу падрыхтоўкі афіцэраў (арганізацыя, якая рыхтуе афіцэраў з вучняў цывільных вучэбных устаноў).

НОВЫЯ ГАРМАТЫ Ў АМЭРЫЦЫ.

Праграма артылерыйскага ўзброеньня берагавой абароны Злучаных Штатаў Паўночнай Амэрыкі прадугледжвае ўстаноўку 28 дужкіх гармат калібру 40,6 сантыметраў. Дзесяць з іх ужо ўстаноўлены. Гарматы прызначаны дзеля аховы бухты Сан Францыско і затокі Чыэтік.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кнігі:

1. „Тры львы"—Нязвычайныя апавяданьні з жыцьця дзікіх і прыручаных львоў. Пад рэдакцыяй Ів. Цьвіковіча. Стар. 59, цана 25 кап.

2. «Прыгоды васьмінога»—пераклад з расейскай мовы. Вокладка і малюнкі Д. Дваракоўскага. Стар. 15, цана 35 кап. Выданьне Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва. Менск.

3. «Спажывецкая каапэрацыя БССР»—за 1926-27 гаспадарчы год. Выданьне Белкаапсаюзу. Менск.

4. „Плуг" № 5-6. Стар. 87, цана 60 к. Выданьне Дзяржаўнага Выдавецтва Украіны.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

(НА 21-VIII-1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—67,5 куп. 4—65,5.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—19,5, куп. 5—17,5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—03,5, куп. 5—01,5

Абл. 10 пр. паз. 27 году —прад. 26,15, куп. 26—05.

Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 122,75, куп. 120,75.

Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 102—70, куп. 102—65.

Абл. 6 проц. паз. індустр. прад. 25—42, куп. 25—32.

Паштовая скрынка.

В. Жызьнеўскаму. Апавяданьне ваша «Чарнаеское гняздо» ня пойдзе. Вы зусім не валадаеце элементарнейшымі прыёмамі і мастацкай тэхнікі і вам трэба шмат вучыцца. Да таго-ж і тэма апавяданьня ўжо шмат разоў выкарыстоўвалася іншымі аўтарамі. Верш ня пойдзе на тых самых прычынах.

А. Жаўруку. У вашых вершах спатыкаюцца досыць цікавыя і арыгінальныя вобразы. Але ў большасьці вы пацалі пад уплыў беспрадметнай лірыкі і пішаце на тэмы стаўшыя ў нас трафарэтнымі. Трэба стараца даць больш жывога і новага матар'ялу, а таксама больш сачыць за тэхнікай сваіх вершаў: яна ў вас кульгае. Прысланы вамі верш ня пойдзе.

Барысу М. Фэльетон ня пойдзе: напісаны занадта сухо і самая тэма мала падобна да фэльетоннай.

Тав. Анцыброву. „Зрыў пасяўной кампаніі" накіроман у ЦКК-РСІ для расьсьледваньня.

Дубавіку А. «Не падкапаешся»—не паступіла.

Званку. Залічаны. «Каапэрацыйная валакіта»—пойдзе. «Аб недахопах пры ўдачы пасуды»—не атрымана.

Х. Зану. «Аб Радкевічу»—накіравана ў АКК. Усе іншыя заметкі зьмяшчаюцца. Прысылка на расейскай мове не зьяўляецца перашкодай для зьмяшчэньня допісаў, але пісьменне пажадана на белмове. Гэта скарачае працу рэдакцыі.

Агейчыку Міколе. «Куды ісьці, каму пажаліцца?»—будзе скарыстана.

Радзько Парасцы. Ваша скарга накіравана пракурору Бабруйскае акругі.

Н. Хамічэнка. Ваша запытаньне накіравана ў Бабруйскі акругком для растлумачэньня.

К. Баньвініну. Залічаем. Дасылайце допісы. Падрабязнае паведамленьне будзе пасланае вам лістом.

Міхайлаву А-дру Ав-чу. Ваш ліст пераслан у Беларускае аддзяленьне т-ва б. політкаторжан.

Тав. Валкавыцкаму. Гаварар выслаў. Тэрміновае можна перадаваць па тэлефону № 2-44 за наш кошт. Тэлефон апісчан.

Студэнту. Ваш допіс „Неабходна вызначыць праэкт Наркамасьветы" пераслалі ў Наркамасьветы дзеля растлумачэньня закранутага вамі пытаньне.

М. Крывецкаму. (М. Круглае) «Аб перавыбарах па Круглянскаму райёну» ня пойдзе: у допісе няма нічога канкрэтнага.

«Пчале». Ваш допіс „Два трутні" пераслалі ў Заслаўскі РВК дзеля расьсьледваньня.

А. Эйцінгіну. 12-8 Вам пасланы адказ 16-8—гаварар.

А. Карлоўскаму. Вашы допісы зьмяшчаюцца. Яны на горшыя іншых. Сачыце за газэтай. Дасылайце яшчэ.

Аранкову. «Па абабраньню, альбо на пазьнчэньню»—ня пойдзе. Накіравана ў НКЗ для растлумачэньня вашай прапановы. Чакайце адказу.

Часова вык. абав. адк. рэд.

П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-ЦЫРК-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР. Аўторак, 21 жніўня. При ўдзеле Багаленавай, Бэнгард, Брыгіневіча, Осіпава, Чарнышова, Майкава „ЖИДОВКА". Опэра ў 5 карц., муз. Галеві.

ЦЫРК. Сёньня выступленьні нова запрошаных артыстаў, а таксама гастролі прм'ераў дзяржцыркаў. ЦЫРК. у 3-х вялікіх аддзяленьнях—15 нумароў. Наезьнікі бр. СЭРЖ. Стайна—ВІЛЬСОН. Велёсыпэдысты бр. ВАРТАНІЁ 4. Гімнасты бр. ЭДЭР. Муз. эксцэнтрыкі АРА І МАЙ. У часе антрактаў публіка можа наведаць стайні. Пачатак роўна а 8 з палов. гадзіне. Каса адчынена з 11 да 3 гадзіны і з 5 да 9 гадзіны ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». Грандыёзны мастацкі гістарычны баявік „ЛЁДАВЫ ДОМ". Пачатак а 7 гадзіне.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Нямецкі мастацкі баявік «ЧЭМПІЁН СЬВЕТУ» ў 7-х частк. У гал. ролі—Ісені Дэсьні (вяд. па фільму «Вільгельм Тэль» і ін